Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 5 (2647) Год LII | Беласток, 4 лютага 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Антоні Масевіч з Музея ў Цеханоўцы: — асабліва ў Бельскім і Гайнаўскім паветах захавалася шмат драўлянай забудовы, перш за ўсё жылых дамоў...

Захавалі дух хат

У леташнім выданні конкурсу, арганізаванага Падляшскай ваяводскай управай „На найлепш захаваны помнік вясковага драўлянага будаўніцтва ў Падляшскім ваяводстве" першую прэмію здабыла „Сцяпанава гаспадарка" Сцяпана Чабая з Новаберазова. Стаяць на ягоным падворку дом драўляны і хлявы з 1863 г. ды драўляная хата з 1901 года, пад нумарамі 90 і 92. Сцяпан сваю прэмію выдасць на... 8 тон зерня для сваіх страусаў — агратурыстычная гаспадарка ды гадоўля гэтых экзатычных птахаў гэта яго хобі. Другое месца м.інш. атрымалі плябанія праваслаўнага прыхода св. Мікалая ў Белавежы, пабудаваная ў 1891 г., па вул. Спартовай, драўляны жыллёвы будынак з 1932 г. Адама Тамашука з Сацоў (н-р 44), а на трэцім месцы апынулася драўляная хата з 1945 г. з Масева-Старога (н-р 94), якога ўласнікамі з'яўляюцца Аліцыя і Андрэй Карчэўскія (пражываюць яны ў Замошшы).

На конкурс былі заяўлены 197 аб'ектаў прыватна ці праз установы (у 2005 годзе было іх толькі 31). Камісія ў час працы адкінула 46 заяў як не адпавядаючых крытэрыям акрэсленым у рэгламенце конкусу (будынкі былі, напрыклад, мураваныя або па-навабагацку перароблены і аздобленыя). Апошнія з піетызмам захавалі і ўмацавалі спадчыннікі будаўнікоў ці часам чужыя людзі, якім трапілі ў рукі гэтыя каштоўныя помнікі даўніны.

— Асабліва ў Бельскім і Гайнаўскім паветах захавалася шмат драўлянай забудовы, перш за ўсё жылых дамоў, — сказаў, Антоні Масевіч (старшыня журы), з Музея сельскай гаспадаркі ў Цеханоўцы, на падвядзенні вынікаў конкурсу ў пятніцу 26 студзеня, у тым жа музеі. — Аб'яўляючы конкурс, арганізатары хацелі паказаць мясцовым грамадскасцям і ўладам будынкі і іх уласнікаў, якія стараюцца захаваць заадно так іх архітэктанічны стан, як і інтэр'ер. І гэта, і тое ў час тэхнічнага прагрэсу не такое лёгкае. Рэдка таксама сустракаецца са зразуменнем так уласнікаў гэтых будынкаў, як і мясцовай грамады ды таксама некаторых чыноўнікаў, асабліва гміннага ўзроўню, іхная культурная каштоўнасць і неабходнасць захавання іх у нязменным стане пры адначасным дбанні захавальніка помнікаў. Некаторыя ўласнікі былі збянтэжаны, засаромлены прыездам камісіі, не разумеючы, што можа цікавага быць у іхных „несучасных" будынінах. Іншыя дбаюць не толькі аб выгляд будынка, але і збіраюць старую мэблю ды прадметы. Ідэяй конкурсу было м.інш. дапінгаванне гмінных улад і ўласнікаў да дбання аб стан аб'ектаў і зважання на іх красу і культурную каштоўнасць. На жаль, шмат гмінных устаноў, а яны ж з'яўляюцца найбліжэйшай уладай, не прыкмячае такой патрэбы. Без унутранага перакананання, гонару з культурных скарбаў на сваёй тэрыторыі, падтрымкі і дапамогі ўласнікам, кіруючыся адно чыноўніцкай руцінай, няшмат добрага можна зрабіць у гэтай справе. У конкурсе, на жаль, прадстаўляліся толькі 32 гміны са 118 на тэрыторыі Падляшскага ваяводства. З другога боку, без дапамогі гмінных устаноў на конкурс было заяўлена толькі больш дзесятка аб'ектаў. Сабраныя матэрыялы апублікаваны ў альбомах, пераможцы — у адмысловым каталогу, каб паказаць самыя цікавыя аб'екты. Вельмі дрэнна, што шмат уласнікаў папраўляе, мадэрнізуе ці нават пераносіць драўляныя будынкі і рухомыя аб'екты без кансультацыі дарадчыкаў. Такія працы, часам пры вялікіх коштах, няраз прыносяць аграмадныя культурныя шкоды, якія часта немагчыма выправіць. Мы верым, што нашы дзеянні звязаны з конкурсам, мода на захаванне аб'ектаў драўлянага будаўніцтва, як і ўзрастаючая свядомасць іх уласнікаў распаўсюдзяць у нашым ваяводстве шырокі трэнд для захавання матэрыяльнай культуры.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Айцец Сяргей Корх з прыхода св. Мікалая ў Белавежы, Сцяпан Чабай з Новаберазова, Аліцыя і Андрэй Карчэўскія з Замошша і Адам Тамашук з Сацоў — пераможцы конкурсу

Да конкурсу можна заяўляць жыллёвыя будынкі — хаты, дворыкі, „чваракі", хаткі пуцявых абыходчыкаў, гаспадарчыя — свіронкі, стадолы, вазоўні, манежы, будынкі публічнага ўжытку — вакзалы, шынкі, школы, сядзібы ўправаў гміны, гмінныя свірны, прамысловыя будынкі — ветракі, млыны, кузні і г.п., цэлыя гаспадаркі і двары, усе пабудаваныя да 1956 года. Сярод вылучаных былі м.інш. будынак пошты ў Нараўцы, а ў альбоме памешчаны м.інш. будынак плябаніі ў Семяноўцы і хата спадара Аніскевіча, што па вуліцы Ліпавай у Семяноўцы, з паловы пяцідзесятых гадоў.

— Я зусім негаваркі! — прызнаўся Сцяпан Чабай, якога, як пераможцу, выклікалі ўзяць слова на ўручэнні ўзнагарод. Камісія звярнула ўвагу таксама і на тое, з якім знаўствам ён сам падабраў інтэр'ер хацін. — Што ж сказаць... Я стараўся захаваць дух дому.

Адам Тамашук родам з Сацоў (працуе пекарам у Беластоку) прадставіў разам з маці дом, які збудаваў ягоны дзед. — Каб задбаць аб нашу хатку, крыху гэта і каштуе, — кажа. Сапраўды, дом Тамашукоў у Сацах выглядае проста казачна — відаць руку і майстра-будаўніка, і спадчыннікаў, якія больш робяць чым гавораць.

Спадарства Карчэўскія з Замошша (Нараўчанская гміна) каля Масева — прыезджыя. Набылі яны ад спадчыннікаў будаўніка іхняй масеўскай хаты спадара Мацкевіча будынак і старанліва задбалі аб яго выгляд. — Для нас гэта вялікі гонар — гэтая ўзнагарода, перш за ўсё таму, што мы да гэтай пары былі нетутэйшыя, — кажа ляснік Андрэй Карчэўскі. — Такім чынам і мы прыўнеслі свой уклад у тутэйшую культуру.

Міра ЛУКША

Чаканне з мора пагоды ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Беларуская апазіцыя ўсё больш маргіналізуецца. Пасля няздарнай кампаніі па „выбарах у мясцовыя саветы", якая ў значнай ступені дапамагла ўладзе правесці чарговы фарс-спектакль, уплываць на шырокія масы насельніцтва будзе яшчэ цяжэй. Тым больш, што трэшчыны і супярэчнасці ў асяродку аб'яднанай апазіцыі перараслі ў чарговы раскол. Застаецца, як кажуць, сядзець і чакаць з мора пагоды. Але ніякі чараўнік на блакітным верталёце не прыляціць і не падарыць беларусам свабоду...

У Мельніцкай гміне ☞ 4

Міхал МІНЦЭВІЧ

Мельнік, які да 1934 года карыстаўся правамі горада, сёння з'яўляецца сядзібай гміны і вельмі атракцыйнай загараднай вёскай, распаложанай на высокім правым беразе Буга ў шаснаццаці кіламетрах ад Сямятыч. У X-XI стагоддзях было тут умацаванае паселішча, разбуранае ў 1240 годзе ў час мангола-татарскага нашэсця. У 1440 годзе Мельнік стаў горадам...

Грыша МАРОЗ

Стараберазова распаложанае ў сярэдзіне сваіх палеткаў, якія маюць форму квадрата. А гэта дзякуючы людзям, якія землямеру, калі той мераў палі для вёскі, далі хабар — жывога барана. Як з гэтага відаць, хабарніцтва цягнецца даўным-даўно, толькі тады ніхто з гэтым не ваяваў. Таму вось так выглядаюць нашы палеткі. З паўднёвага боку граніца нашых палёў прабягае пад самымі будынкамі вёскі Махнатае (пэўна сяляне гэтай вёскі хабару не далі)...

Руская статыстыка 1863 года ☞ I

Алесь ЧОБАТ

Здавалася б, Студзеньскае паўстанне 1863 года даўно даследавана ўздоўж і ўпоперак — як з нацыянальна-рамантычнай, так з рэалістычнай пазіцыі. Створаны, і потым абвергнуты, усе магчымыя міфы і легенды... Але неяк па-за ўвагай тое, што пакінулі ў архівах „першыя гісторыкі" таго паўстання... паліцэйскія і жандарскія „муравьёвские офицеры"...

9 770546 196000

Чаканне з мора пагоды

„Сядзі ў будзе і чакай, што будзе", — прыблізна так можна характарызаваць стан сённяшняга беларускага грамадства. Расійска-беларускі эканамічны канфлікт, які прыдбаў і палітычную афарбоўку, спакваля ўлагодзіўся і перайшоў у дрымотны стан. Калі пачнецца новы віток напругі, не ведае ніхто, але амаль усе мяркуюць, што ён непазбежна надыдзе.

Беларуская апазіцыя ўсё больш маргіналізуецца. Пасля няздарнай кампаніі па „выбарах у мясцовыя саветы", якая ў значнай ступені дапамагла ўладзе правесці чарговы фарс-спектакль, уплываць на шырокія масы насельніцтва будзе яшчэ цяжэй. Тым больш, што трэшчыны і супярэчнасці ў асяродку аб'яднанай апазіцыі перараслі ў чарговы раскол. Застаецца, як кажуць, сядзець і чакаць з мора пагоды. Але ніякі чараўнік на блакітным верталёце не прыляціць і не падарыць беларусам свабоду. Хіба што толькі, як у той дзіцячай песеньцы „задарма пакажа кіно". Спадзявацца на альтруізм Захаду асабліва не варта. З гарантаў нашай незалежнасці толькі ЗША больш-менш паслядоўныя ў сваёй пазіцыі, заявах і дзеяннях. Яшчэ адзін удзельнік так званай будапешцкай канвенцыі (па якой моцныя дзяржавы свету дэкларавалі ў 1994 годзе абарону суверэнітэту Беларусі) — Вялікабрытанія — пераважна маўчыць. З Расіяй як „гарантам" усё зразумела. Еўразвяз жа вядзе зараз інтэнсіўныя перамовы з Рэспублікай Беларусь. Адзін візіт кіраўніка еўрапейскай Парламенцкай Асамблеі Рэнэ ван дэр Ліндэна ў Мінск чаго варты. Ён сведчыць пра тое, што нешта зрушылася. Толькі ў які бок? Ці пойдзе сённяшняя беларуская дзяржава на больш актыўны дыялог і супрацоўніцтва з Еўропай пасля „расчаравання" ў „брацкай" любові Расіі? Найбольш актыўна паводзіць у дачыненні да Беларусі зараз Нямеччына, адзін з бліжэйшых еўрапейскіх саюзнікаў Расіі. Таму гэта больш насцярожвае, чым абнадзейвае. З іншага боку, Меркель — гэта не Шродэр, палітыка якога палягала ў фарватэры расійскіх імперскіх інтарэсаў і была цалкам шкоднай для малых еўрапейскіх дзяржаў.

З гадамі найбольш зацятыя айчынныя „заходнікі" (гадоў пяць таму да іх ліку залічыў бы я і сябе) становяцца стрыманымі славянафіламі, ці хутчэй прыхільнікамі „швейцарскага варыянту" нейтралітэту. Многія спадзяюцца, што да яго можа прыйсці і цяперашняе кіраўніцтва краіны. У гэта верыцца слаба, бо каб дбаць пра Беларусь, трэба мець беларускае дзяржаўнае мысленне, а не савецкае, ці „общаславянское". Немагчыма нішчыць нацыянальную мову і культуру і пры гэтым мацаваць беларускую дзяржаўнасць. Рэч простая як мінскі праспект Скарыны, хоць яго назву і памянялі.

Аляксандр Лукашэнка даў два інтэрв'ю для нямецкіх мас-медыяў. Адно з іх Аляксандру Рару, вядомаму ідэолагу нямецкай палітыкі на ўсходзе, другое газеце „Welt am Sonntag". У гэтых гутарках з вуснаў кіраўніка Беларусі прагучала некалькі „антырасійскіх" выказванняў. Маўляў, і рубель расійскі нічога не варты, і памкненні яе нахабна захопніцкія. Толькі асабліва цешыцца з такіх заяваў прыхільнікам беларускай незалежнасці наўрад ці варта. Словы маюць адну цану, а дзеянні зусім іншую. Тым больш, што дэмакратызацыяй у Беларусі нават не пахне. Наадварот, кожны дзень прыносіць усё новыя звесткі пра запалохванні, пераслед, рэпрэсіі, вярбоўкі. Асабліва паслядоўна і моцна ціснуць на моладзь, якая найбольш актыўна імкнецца выявіць свае погляды. А міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў па-ранейшаму заяўляе, што ў краіне няма палітычных вязняў, што людзей садзяць у турмы (нават толькі за іх іншадумства!) законна і справядліва. Так што лягчэй дачакацца глабальнага сусветнага пацяплення (знаўцы цвердзяць, што яно ўжо ідзе), чым „пагоды" ў дачыненні да сваіх грамадзян з боку ўладнага мінскага „мора".

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Нафта-газавая каніцель

Нядаўна я пахваліў расійскае дзяржаўнае кіраўніцтва за тое, што яно і намнога маладзейшае ад савецкага, і лепей адукаванае, і прыгажэй апранутае, і менш медале-ардэнаноснае, і не лезе цалавацца. Ды і пачало здавацца, што больш рацыянальную ўнутраназнешнюю палітыку яны вядуць. Але пасля нафта-газавай каніцелі стаў я моцна сумнявацца ў рацыянальнасці іх палітыкі. Бо як толькі ўзнікае нейкае непаразуменне ці канфлікцік паміж Расіяй і нейкай іншай краінай, адразу і грымяць у Думе думцы: не покупать их товаров, а уже купленные выливать и выбрасывать; закручивать нефте-газовые провода и не дать им нашей нефти и газа!.. І выліваюць, выкідаюць ды закручваюць. А мне ж дасюль здавалася, што Дума паходзіць ад — думаць.

У гаспадарчай палітыцы і гандлі не павінна быць лепшых і горшых, а павінны быць усе роўныя, проста партнёры. Неразумна дашуквацца хто нам прыяцель, а хто не зусім, хто нас любіць, а хто — не. Ці вымушаць нейкія палітычныя ўступкі. Калі ж і сапраўды хтосьці нас не любіць, то зноў жа варта падумаць чаму не любіць? Можа мае на гэта важкія повады?

У сваёй гісторыі ўсялякае бывала з Расіяй-матушкай і з Савецкім Саюзам-бацюшкам. Далёка не ўсе народы былі задаволены з таго, што з'яўляліся грамадзянамі Расіі ці, тым больш, Савецкага Саюза. Не былі задаволеныя і тыя, якія жылі быццам бы і ў сваіх незалежных дзяржавах, але пад дыктоўку старэйшага брата, які дыктаваць то ўмеў, але жыць разумна і заможна ні халеры. Вось і адкладалася ў многіх народаў крыўд на старэйшага брата нямала. Значыць, трэба цяпер пакінуць іх у спакоі — няхай жывуць уласным розумам і на ўласны рахунак. Але, як бачым, старэйшы брат ніяк пагадзіцца з гэтым не можа, і чым толькі можа дакучае ім. І гэта нядобра.

Зрабіць жа Расію справядлівай, дэмакратычнай і заможнай усё ж такі можна і нарэшце трэба. Досыць нацярпеліся яе жыхары і народы ад яе, а козыраў да направы ў яе надалей многа. Яна надалей велізарная, багацейшая ўраджайнымі землямі, багатымі нетрамі, водамі, цярплівым і вынослівым народам і ненайгоршым капіталам. Толькі ўмець усё гэта адпаведна загаспадарыць, выкарыстаць... і Расіюшка, на зайздрасць сваім ворагам, проста працвітаць будзе. Чаго я ёй і жадаю...

А цяпер давайце вернемся яшчэ раз да громкіх, непатрэбных, па-мойму, бо шкодных для Расіі крыкаў яе думцаў у Думе. Яны патрабавалі байкоту грузінскіх і малдаўскіх тавараў, бо быццам вельмі шкодныя расіянам яны, чуць не пагалоўная атрута. І падобна такімі заўсёды былі яны. І дабіліся свайго — улады забаранілі прывозіць іх, а ўжо прывезеныя знішчылі. Страшна, бо гэтыя ж тавары расіяне куплялі і са смакам спажывалі дзесяткі гадоў. Афіцыйнай атрутай для расіян сталі яны толькі тады, калі Малдавія і Грузія аказаліся непаслушнымі Расіі. Дзе ж тут сэнс, дзе логіка?! Гэта сведчыла б, што або ўлады Расіі ведалі, што кормяць свой народ атрутай і маўчалі, або гэта чыста палітычная справа. Адно горшае ад другога...

Апраставалосілася Расія і са сваёй нафтай і газам. Крык думцаў „не дать!", „закручивать" газ і нафту Украіне і Беларусі так напужалі заходнееўрапейцаў, што яны пачалі шукаць альтэрнатыўных выхадаў. І напэўна знойдуць іх, на чым моцна страціць Расія, бо сваю гандлёвую верагоднасць ужо страціла.

Вельмі смешна гучыць тут выражэнне „не дать!" Расія нікому, ніколі, нічога і не давала, а толькі прадавала. А гэта ўжо зусім іншая байка. Тут абавязваюць узаменыя дамовы, якія патрабуюць поўнай гарантыі.

А з другога боку, чаму б, здаецца, Беларусі, Украіне і не прадаваць нафты і газу танней, так, напрыклад, як у самой Расіі. Гэта ж — помніцца мне — „дружественные", „братские" Расіі народы і да магілы „мы вместе". Яны найбольш пацярпелі ад савецкага таталітарызму, гінулі ў Афганістане за нейкія крамлёўскія інтарэсы, падымалі цаліну ды будавалі Расіі розныя БАМы — і нейкая кампенсацыя ад Расіі, спадкаемніцы Савецкага Саюза, належыцца ім. Пераважна Беларусі.

Украіна, папраўдзе, ад Савецкага Саюза атрымала ўжо някепскі пасаг — Крым, частку савецкага флоту і чарнаморскую ваенна-марскую базу, за якую рэгулярна атрымоўвае ад Расіі някепскі грош. А Беларусь-бідуля — толькі атэізм, калгасы, русіфікацыю і Чарнобыль. Адным словам, выйшла, а дакладней кажучы, вывелі яе з Саюза з голым пупам...

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

Адышоў вялікі паляшук

У панядзелак 22 студзеня папрасіў мяне мой шэф „на дыванік". Мы планавалі, аб чым будзем пісаць у найбліжэйшы час. Шэф запрапанаваў цыкл размоў, між іншым, з прызнаным у свеце, а народжаным у Пінску рэпартажыстам Рышардам Капусцінскім. Я ўвечары ўзяўся нанова пераглядаць ягоныя кнігі: „Cesarz", „Wojna futbolowa", „Lapidarium", „Imperium", „Heban" ці ўрэшце дэбютанцкі „Busz po polsku". Асабліва гэтая апошняя кніга, значыць, цыкл рэпартажаў з Польшчы 1958-1961 гадоў схіліла мяне задаць Рышарду Капусцінскаму шэраг пытанняў. Спасылаліся яны ў сваім замысле да сцвярджэння самога аўтара аб цыкле, які публікаваўся ў „Палітыцы", а змешчанага ў „Бушу": „Я пісаў аб Польшчы, якая мяне найбольш захапляла — гэта была польская правінцыя, польская вёска, польскія малыя мястэчкі. Я сам паходжу з малога мястэчка, з крэсаў. Таму памер малога мястэчка, малой грамадскасці мне найбольш адпавядае. Гэта ёсць такая чалавеча прастора, якую можна абысці ў час аднаго шпацыру, дзе ўсе ведаюць адны адных. Гэта было штосьці найбольш мне блізкае". Аб той прасторы напісаў таксама ў рэпартажы „Daleko. Cisówka". „Сюды вучоныя ніколі не прыязджалі. Калі чалавек вучоны, дык носіць ён акуляры. Такія час ад часу бачыліся ў ваколіцы. Хадзілі, спісвалі абрады, звычаі, вясельныя спеўкі. Мелі тут рай. Бо гэтая праклятая зямля была раем для этнографаў. Гэтая прэлая беластоцкая багна, прытоеная ў цяні Белавежскай пушчы. І тая Цісоўка, закінутая дзесьці ў разгалінаванні рэк Нарвы і Свіслачы, такім раем магла быць. Панове, — дакладваў нам ва універсітэце прафесар, — калі да вайны хацелі б вы знайсці аўтэнтычную славянскую задругу, якая была характэрнай перыяду першабытнай абшчыны на нашым абшары Еўропы, мусілі б вы ехаць — о, у гэтыя бакі. І пальцам вадзіў па карце ў ваколіцах Ваўкавыска, Заблудава, Сямятыч. І гэтай Цісоўкі таксама". І ў канцы рэпартажу апісваў ваколіцы закрэсленыя пальцам ягонага прафесара. „А лес які, цудоўны! Зялёны цень, вільготны пах. Дзе ты, дрэва вялікае і гордае? Разгалістае. Цягнік едзе стуку-стуку, едзе цягнік здалёку, соцна свеціць у рытме ча-ча. Прыгожа!"

Я хацеў з панам Капусцінскім паразмаўляць якраз аб разгалістых дрэвах, вялікіх і гордых. Як можа сёння прыгожа тут быць. Як справіцца з тугой па малым мястэчку на Палессі, сёння беларускім, тамашнім як ягоны Пінск, і тутэйшым у яшчэ меншай прасторы, як Цісоўка. Не паспеў. Назаўтра, пасля размовы з шэфам аб нашых журналісцкіх планах, Польшчу — а хіба і ўвесь свет — абабегла інфармацыя: Рышарда Капусцінскага няма ў жывых. Не паспеў. Ізноў? Жаль ахінуў мяне. Пэўна, таксама і іншых, хоць бы і Сакрата Яновіча: „Ён гаварыў так, што адчувалася што ён з усходу, з Беларусі. Гэта ўдаецца распазнаць — гэта такая мяккасць, лагода мовы, гармонія сказаў, у яе свой пах, клімат. Няма ў гэтым нахабнасці ані катэгарычнасці (...). Ён памог мне зразумець, што рэвалюцыя пачынаецца, калі паяўляецца больш паветра, калі можна параўнацца, і што гэта мае заўжды маральны падтэкст". Як прызнаўся Сакрат Яновіч, Рышард Капусцінскі хацеў, каб пісьменнік з Крынак пераклаў на беларускую мову Ягонага „Кесара". Я думаю, што ўсё яшчэ варта. Хоць бы таму, аб чым успомніў Ён сам: „Дарога настолькі важная, наколькі кожны крок на ёй набліжае нас да сустрэчы з іншым. Бо для таго мы ў дарозе. Ці іначай па сваёй волі падвяргаліся б мы цяжкасцям, ішлі на рызыку ўсялякіх нявыгад і небяспек?"

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Для сваіх людзей

Старэйшаму пакаленню беларусаў Беласточчыны найбольш хіба яркай праявай нашай культурнай актыўнасці была эстрадная група „Лявоніха". Калектыў у 1960-х гадах з'ездзіў усю Беласточчыну, і хіба няма такіх людзей таго часу, якіх бы ён не адухаўляў. Былі гумарэскі, былі песні, але былі і танцы, бадай найбольшая экспрэсія чалавечай радасці, своеасаблівага палёту ў бок неба, у бок раю. А публіку радаваў і танцам, і непаўторнай усмешкай Янка КРУПА. Хіба зашмат не памылюся, калі за Маякоўскім сцверджу: гаворым „Лявоніха" — думаем Крупа... Папрасіў я яго расказаць пра сябе.

З Галінай Ціміцкай у „Лявоніхе"

Вёска

Нарадзіўся я ў Рудутах на восені 1937 года, а запісалі мяне ў дакументах пад датай нараджэння 3 студзеня 1938 года. Бо тады так на вёсцы было, жанчыны радзілі дома, роды адбіралі мясцовыя бабкі-павітухі, а ў дакументы пісалі тады, калі быў час у гміну схадзіць. І калі дакладна я нарадзіўся — невядома. Гэтаксама наконт майго брата, старэйшага за мяне, які нарадзіўся ранняй вясною, а ў які дакладна дзень — таксама невядома. Лепш пашанцавала сёстрам, іхнія даты нараджэння можна было ўстанавіць, бо адна нарадзілася як у суседа вяселле было, а другая — на Казанскую. Такі быў тады на нашай вёсцы ўклад жыцця. Як у Коласа „У палескай глушы". Як у Рэдлінскага „Канапельцы". То ж у вайну немцы прыязджалі да нас здымкі рабіць гэтай нашай экзотыкі. І пра культуру тут ніхто не дбаў; тут адно мужыкі для работы былі. Калі хто ў вёску ў капелюшы завітаў, то ўжо ён вялікі пан быў!

Мае абедзве бабулі са Шчытоў былі. Мой тата пры цары элементарную школу ў Шчытах быў кончыў. Вельмі добра ведаў рэлігійныя справы, чытаў Псалтыр, а калі нябожчык у вёсцы быў, мой тата вёў адпяванне. А пасля належаў да партыі і гэта дазваляла яму аб'ектыўна глядзець на свет. І яшчэ адзін сямейны экскурс: матушка з Рыбалаў Тоня Сасна гэта дачка маёй дваюраднай сястры.

Час пасля вайны неспакойны быў. Калі я зімою выходзіў на вуліцу гуляць, мне мама гаварыла: толькі ад снежак каб мокрымі не былі, каб ноччу — калі што — можна было ўцякаць...

Школа

У 1947 годзе школу ў Рудутах адкрылі і я адразу ў другі клас пайшоў, бо ўжо мама дома крыху мяне грамаце падвучыла. У школу ў сваёй вёсцы хадзіў я да чацвёртага класа, а далей — у Орлю. Загадчыкам арлянскай школы быў Лашкевіч. Настаўнікамі былі ягоная жонка Барбара, Федарук з Арэшкава, які пазней навучаў у бельскім педліцэі, Ляшчынскі.

Закончыў сем класаў у Орлі і пытанне: куды далей? У Бельску быў інтэрнат і для яго я падаўся ў бельскі педагагічны ліцэй, хаця пра навучанне не думаў. У Бельску Таня Гіжэўская арганізавала харавы калектыў, акампаніраваў Пётр Нявінскі. Школьны хор вёў Баляслаў Мяшальскі і ён нас многа беларускіх песень навучыў. Ён сам на скрыпцы іграў, а раней выступаў у славутай капэле Дзержаноўскага. І яшчэ быў хор пры Доме культуры тэкстыльшчыкаў ільнозавода (так тады называўся цяперашні Бельскі дом культуры), і там Мацяеўскі вёў хор. А я любіў музыку. І той час быў зорным часам музыкі. Людзі спявалі, цешыліся, што вярнуліся з вайны. Асабліва папулярныя былі франтавыя песні, напр. „Огонёк". Ды і людзі самі стваралі песні, таксама пра вайну. Песеннымі кумірамі таго часу былі хоры Пятніцкага і Аляксандрава. У ліцэі, калі толькі быў перапынак, вучні спявалі „Малдаванку", а Мяшальскі апладзіраваў!

Пачаткі

Як узнікла Беларускае грамадска-культурнае таварыства, то ўсё стала пад беларускую шырму. Спачатку людзі баяліся, ці хаця такая дзейнасць легальная. У кожнай вёсцы штосьь было. На Сакольшчыне ў кожнай школе вялося навучанне беларускай мовы. У Белавежы быў хор Вашкевіча, у Гарадку дзейнічала ўжо Ніна Мушынская. У Бельску ў белліцэі Кастыцэвіча быў духавы аркестр. А ў маім педліцэі да беларушчыны ставіліся насцярожана, асабліва настаўнік беларускай мовы! Калі ў 1957 годзе ў „Ніве" паказаўся мой здымак, дык мне ў ліцэі ўчынілі немалую авантуру! Але Танька Гіжэўская, якая ўжо працавала ў БГКТ, узяла мяне да свайго калектыву. І я, будучы яшчэ вучнем бельскага педліцэя, выступаў ужо на сцэне ад Беластока! У 1958 годзе закончыў я ліцэй і неўзабаве прыйшла павестка ў войска...

У той час старшынёй ГП БГКТ стаў Станкевіч; ён для таварыства найбольш зрабіў. Ён меў моцную пазіцыю ў партыі, а партыя калісь мела не меншыя магчымасці чым сёння духавенства. Гэта менавіта Станкевіч выхадайнічаў таварыству цяперашні будынак, што па вуліцы Варшаўскай. Будынак раней быў уласнасцю нейкага багатага жыда, у ім была калісь, м.інш. бойня, а калі туды перабіралася таварыства, то там яшчэ працаўніца УБ начавала. І Станкевічава рука, мабыць, вяла і мяне. У войска ўзялі мяне ў беластоцкую пагранчасць. І зараз пасля прысягі дзяжурны афіцэр паведаміў мяне, што маю пільную справу на горадзе і трэба мне зараз ставіцца на вуліцу Варшаўскую, 11! Заходжу, а там мяне чакаюць! І так, па сутнасці, то я вайсковую службу адслужыў у БГКТ. У самой вайсковай часці я падлягаў пад палітычны аддзел і вёў хор ды асветныя справы.

У пачатках дзейнасці БГКТ конкурсаў, такіх як цяпер, не было. У 1957 годзе Міністэрства ўнутраных спраў, якое курыравала нацыянальныя меншасці, арганізавала агляд нацыянальных калектываў у Тэатры размаітасцей у Варшаве. А ўжо ў 1959 годзе такі агляд атрымаў прафесіянальнае афармленне. Адбыўся ён у Нацыянальным тэатры, а рэжысёрам мерапрыемства была прафесар Межаеўская, спецыяліст па масавых відовішчах, якая пасля ладзіла, м.інш., цэнтральныя дажынкі. Ад нас паехала 12 танцавальных пар, каля сарака чалавек хору на чатыры галасы, аркестр; дырыжорам хору быў Міхал Ануфры, а танцавальным калектывам кіравала Таня Гіжэўская.

Лявоніха

У 1960 годзе выйшаў я з войска. Недзе ў той час Таня Гіжэўская выехала ў Гданьск. З „Нівы" Васіль Баршчэўскі адышоў у камітэт, Сакрат Яновіч у таварыства. Станкевіч адышоў у Варшаву, на яго месца прыйшла Лідзія Бялецкая. Наш беластоцкі калектыў вялікі быў, мог ён выступаць толькі на вялікіх сцэнах, але складана яму было выступаць на вёсках, дзе такіх памяшканняў наогул не было. І перад сваім адыходам з таварыства Станкевіч паклікаў мяне і запрапанаваў мне падабраць невялікую групу танцораў, крыху спевакоў з хору і каб з такой групай наведваць вёскі. Далі нам тады самаход маркі ЗІС, вялікі, неабагараваны.

У верасні 1960 года паўстаў ужо задуманы Станкевічам калектыў, яшчэ ён „Лявоніхай" не называўся, толькі эстрадай ГП БГКТ. Назву група атрымала крыху пазней, а хросным бацькам быў Георгій Валкавыцкі. Тады ў „Ніве" пісаў гумарэскі Станіслаў Вагурка і падпісваўся ён псеўданімам Дзядзька Лявонь; і вось гэты псеўданім і навеяў Валкавыцкаму прапанову назваць нашу эстрадную групу „Лявоніхай". Але і тут быў клопат: падабраныя ў эстраду людзі з працы пазвальняліся, а міністэрства яшчэ дазволу не давала на нашу дзейнасць...

Кожную нашу праграму трэба было зацвердзіць у Аддзеле культуры Ваяводскай рады, але там працавалі нашы хлопцы і праблемаў не стваралі. А тэксты кожнага нашага нумару, кожнай песні, зацвярджала цэнзура, там працавала дзяўчына з Рыбакоў, Бура называлася. Плацілі нам па 50 злотаў ад канцэрта...

Гастролі

На Беласточчыне было бездарожжа, не было электрычнасці. У Чыжах была святліца з кіно, але электрычнасці не было. То людзі лямпы папрыносілі, капы, дываны. Далі мы канцэрт, пасядзелі, патанцавалі. Выходзім ад'язджаць, а ў нашага ЗІСа колаў не відаць, так у гразь засеў; і выпхаць яго няма як. Холадна, голадна. Пайшоў я на вёску пашукаць чаго з'есці. Адна жанчына кажа: гарэлку сваю маю, капусту квашаную, хлеб. І так мы сядзімо да чацвёртай гадзіны раніцы. Прыходзіць чалавек і кажа: мая баба хлеб пячэ. Хадзіце пагрэцца. І як там да печы кінуліся... На мяне Стась Валендзюк нагамі наваліўся. Але цёпла было, усе паснулі. І з раніцы мы зноў да нашага ЗІСа. Сталі цэглы зносіць, што ад калгаснай будовы засталіся: і нічога. Але людзі неяк прыдумалі спосаб той самаход выцягнуць.

У школах выступалі, драўляных, цесных. Або ў хатах, што асталіся пасля тых, што да саветаў выехалі. Сцэну людзі з дошак збівалі. А як добра было, калі школа большая была, як напрыклад у Малінніках...

Колькі здароўя ў нас тады было! З Бабік ехалі мы ў Сухінічы. Самаход з коламі ўграз. Прыйшлі людзі, памаглі нам яго выцягнуць. А пасля канцэрта загадчык школы салому прынёс, разаслаў на падлозе, мы так пераначавалі і рана неяк далей паехалі. А пра Сакольшчыну гаварылі, што гэта Сібір. Або ў пажарным дэпо. Мароз, святла няма. Спевакі паліто ці што могуць апрануць, а танцорам як? І людзі пліткі прыносілі нават, каб нам цяплей было. Але найважнейшае было для нас тое, што людзі нас патрабавалі.

З'ездзілі мы ўсю Польшчу: Жэшаўскае — далі канцэрт будаўнікам Саліны, Апольскае, Кялецкае, Ольштынскае, Зялёнагурскае, Гданьскае... Калі ехалі па ваяводстве, то выязджалі на месяц, а калі ў які горад, то аднаразова. У Беларусь з'ездзілі толькі адзін раз, у 1958 годзе, у Гродна. Была ў нас задума паехаць з канцэртам у Мінск, але нічога з гэтага не атрымалася. Прыехаў быў да нас адзін пісьменнік з Беларусі і Міхась Хмялеўскі сказаў: нарэшце хтось да нас з Вялікай зямлі прыехаў. Так, была гэта Вялікая зямля, але не для нас. Гасцей з Беларусі запрашалі ў Варшаву, Плоцк, а нас ад іх стараліся ізаляваць.

У „Лявоніхе" найбольш выступалі танцоркі Галіна Ціміцкая і Оля Андраюк, салісты Ніна Свентахоўская, якая пазней выступала ў Вялікім тэатры ў Варшаве, Валя Сянкевіч, Люба Томчык, Шурка Каліноўскі — ён пачынаў у хоры Шырмы, спяваў таксама ў віленскай оперы, Янка Блізнюк, Янка і Стась Валендзюкі, акардэаністы Янка Гарчыца і Вася Кардзюкевіч. Пазней дайшлі малодшыя: Марыся Мароз, якая выйшла замуж за Стася Пазнанскага з Беластоцкага радыё, Тэкля Вашчук, Часлава Селеванчук, Стась Станкевіч...

Пасля „Нысу" нам міністэрства дало на дзесяць асоб, атрымалі мы штаты... А далей — не хочацца ўспамінаць. Стала занікаць школьніцтва, не стала вялікага нашага калектыву. „Лявоніха" была да 1971 года. І так адзін раздзел майго жыцця кончыўся. Перайшоў я ў Музычны тэатр у Шчэцін.

(працяг у наступным нумары)

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ
Фота з архіва Янкі КРУПЫ

Хто вінаваты?

10 студзеня г.г. атрымаў я ліст ад ПЗУ С.А. у Бельску-Падляшскім аб заплаце страхоўкі за трактар за 2007 год. Пашпорта штампа на канверце няма, а з пісьма вынікае, што адпраўшчык: Centrum Informatyki Grupy PZU S.A. ul. Matuszewska 14, 03-876 Warszawa, выслаў яго 22 снежня 2006 г. Калі гэтае пісьмо сапраўды было выслана з Варшавы, дык яно „ішло" да мяне 19 дзён. Гэта абазначае, што я, пажылы чалавек, пяшком намнога хутчэй прыйшоў бы з Варшавы ў Бялкі, чым гэтае пісьмо! Але заўсёды віна на маім баку, бо я павінен быў заплаціць страхоўку за трактар, гэтак званае ОЦ, да **31 снежня 2006 года**. Я думаю, што такіх людзей, якія страхуюць трактары ў ПЗУ, напэўна ёсць больш. Калі адрасат не возьме пісьма, то зваротны яго адрас такі: Інспектарат ПЗУ С.А. ў Бельску-Падляшскім, вул. Міцкевіча, 32. На мой допіс у „Ніве" павінны адгукнуцца ПЗУ або Пошта польская. Хто тут вінаваты? І каб не абвінавачваць заўсёды плацельшчыка! Адгукніцеся хто-небудзь, даражэнькія.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

З Бельска

Вуліца Квятовая ў Бельску — гэта невялічкая і адна са старэйшых вулак, пабудаваных недзе каля 1958 года, якая спалучае вуліцу Кляшчэлеўскую з Яжамбіновай. Назва яе прыгожая ды не пасуе да рэчаіснасці. Праз усе гэтыя гады жыхары не дачакаліся асфальтавай паверхні. Цяжка тут праехаць аўтамабілем, балота пырскае на шыбы, нельга прайсці пешаходам. Пракладаліся тут нейкія трубы і быў навезены жвір. Дажджы спаласкалі яго і засталася толькі гліна. Калі ўзнікаюць калдобіны, то іх раскатваюць дарожным катком.

Жыхары пыталіся пра рамонт вуліцы ў бельскіх радных, але нічога не даведаліся. Новыя вуліцы дачакаліся добрай паверхні, але вось Квятовая не. Проста ўсе пра яе забыліся. Можа ў гэтым скліканні бельскія ўлады прыйдуць з дапамогай жыхарам гэтай вуліцы, нягледзячы на тое, што не жыве тут ніхто з бельскай знаці.

Жэня МАРТЫНЮК

Ці гэта вясна?

У сераду, 3 студзеня г.г., над Ольштынам паказалася пяць буслоў. Ці яны не адляцелі ў Афрыку, ці мо ўжо прыляцелі назад? Усе буслы прылятаюць да нас у красавіку; адкуль жа яны цяпер узяліся... Некаторыя гавораць, што ўжо зімы не будзе, бо цёпла, без марозаў і снегу.

Напэўна буслы не прыляцелі раней, гэта хіба апошнія буслы, што пазней вылупіліся і таму асталіся на зіму. Як відаць, буслам спрыяе надвор'е і яны могуць здабываць корм. Калі прыступіцца зіма, тады мо ім людзі добрыя дапамогуць.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

У Мельніцкай гміне

Мельнік, які да 1934 года карыстаўся правамі горада, сёння з'яўляецца сядзібай гміны і вельмі атракцыйнай загараднай вёскай, распаложанай на высокім правым беразе Буга ў шаснаццаці кіламетрах ад Сямятыч. У X-XI стагоддзях было тут умацаванае паселішча, разбуранае ў 1240 годзе ў час манго-ла-татарскага нашэсця. У 1440 годзе Мельнік стаў горадам. У XVI ст. важны рачны порт і гандлёвы цэнтр; у той час пачынаецца здабыча крэйды, якая доўжыцца да сённяшніх дзён. Зноў зруйнаваны ў час шведскага нашэсця. Далейшы заняпад горада адбыўся ў XIX ст. у выніку адсутнасці выгадных камунікацый.

Рака Буг

Мельніцкая гміна даволі прыцягальная з-за багацця ландшафтных форм — тут перасечаная мясцовасць з вялікімі адноснымі розніцамі вышынь. Тут пралягае града лабавой марэны з найвышэйшым узгоркам Ушэсце (2 кіламетры ад Мельніка, 204 м н.у.м.), з якога відаць маляўнічую даліну ракі і буйныя лясныя комплексы. Тут знакамітыя кліматычныя ўмовы. Зімою тут можна катацца на санках і спаборнічаць на лыжах, а летам вудзіць і займацца воднымі відамі спорту.

Найбольшай атракцыяй з'яўляецца, аднак, Падляшскі прарыў Буга. Рака ўецца тут паміж аблесеных узгоркаў. Надрэчныя абрывы парэзаны ярамі, дзе месцамі расце асаблівая стэпавая цеплалюбівая расліннасць. У наваколлі шмат назіральных пунктаў. Выдатныя ландшафтныя козыры і ў рэк Машчоная ды Мутная. Аблясенне гміны сягае 70%.

Найбольш атракцыйнай мясцовасцю ў гміне з'яўляецца сам Мельнік, які хадайнічае за статус курорта, з выдатным мікракліматам і ўстаноўленымі крыніцамі мінеральных тэрмічных вод. Вартыя ўвагі таксама Такары з мясцовым праваслаўным свяцілішчам, драўляным касцёлам і драўлянай забудовай.

Прыродныя козыры

Амаль уся Мельніцкая гміна распаложана ў межах Абшару ахоўваемага краявіду Даліна Бугу. Два запаведнікі: Груд Радзівілаў і Гара Ушэсце, прыродна-ландшафтны комплекс Глогі і кар'ер крэйды ў Мельніку, дзе можна знайсці цікавыя скамянеласці.

Культурныя козыры

Комплекс помнікаў у Мельніку: гарадзішча на Замкавай гары з развалінамі капліцы-помніка Аляксандру Неўскаму, а знізу яго развалiны XV-вечнага гатычнага касцёла, знішчанага ў час I сусветнай вайны, касцёл (1912 г.), драўляная царква на могілках (1777), царква (1825) і сінагога (I палова XIX ст.).

Цікавыя таксама комплексы драўлянай вясковай забудовы, асабліва ў Такарах, Сутне, Няміраве, Радзівілаўцы і Мутной. Рэлігійнымі каштоўнасцямі з'яўляюцца драўляная царква ва ўрочышчы Катэрка ў Такарах (1912), таксама ў Такарах драўляны касцёл (1935) і касцёл у Няміраве (XVIII ст.).

Іншыя каштоўнасці:

— гарадзішча ў Няміраве;

— млын у Мацьковічах;

— савецкія доты з 1940-1941 гг. у ваколіцах Мацьковічаў, Машчонай-Каралеўскай і Мельніка.

Важным свяцілішчам з'яўляецца царква з цудоўнай крынічкай у Такарах-Катэрцы, мэта паломніцтваў, а найважнейшае там свята ў трэці дзень Тройцы.

Праз Мельніцкую гміну пралягаюць памечаныя пешыя турмаршруты:

— Купецкі шлях з Нямірава праз Мельнік у Сямятычы,

— Шлях дотаў ад Мельніка да Вулькі-на-Бугу,

— Шлях даліны Машчонай ад Грабаркі праз Шаршні ў Сямятычы-Станцыю.

Вялікай турыстычнай атракцыяй з'яўляюцца таксама Агульнапольскія прэзентацыі культуры нацыянальных меншасцей (жнівень, амфітэатр у Мельніку) і Самаўрадавы байдарачны паход па Бугу. У Мельніку каля 90 начлежных месц (пансіянат і два адпачынковыя асяродкі) і столькі ж месц у трынаццаці агратурыстычных кватэрах ды два біваковыя ўчасткі, таксама ў Мельніку. У гміне два рэстараны (у Мельніку) і два бары (Мельнік і Адамова).

На будучыню

У рамках апрацаванай канцэпцыі развіцця турызму дзеля прыцягнення вонкавай зацікаўленасці Мельніцкай гмінай прадбачваюцца, м.інш., наступныя меры:

— прадаўжэнне цяперашняга Купецкага шляху на адрэзак ад Нямірава праз Такары да злучэння са Шляхам краіны зубра ў Клюковічах;

— разметка прыроднай сцежкі на абрывах даліны Бугу каля Мельніка, якая праходзіла б праз запаведнік Гара Ушэсце і прыродна-ландшафтны комплекс Глогі:

— пабудова ў Мельніку воднай прыстані з пракатам байдарак;

— праект байдарачнага (або лодачнага) паходу з Нямірава ў Мельнік ды, магчыма, далей — у Вульку-на-Бугу, Драгічын ды праект некалькігадзіннай экскурсіі па прыродных і гістарычных асаблівасцях наваколля Мельніка.

Міхал МІНЦЭВІЧ

Кляшчэлеўская даўніна

Даўным-даўно непадалёку Кляшчэль з усходу на захад прасціралася даволі шырокай паласой багна, мясцамі дрыгва. Цераз гэтую балоцістую паласу сачылася рэчка Нурэц. Над рэчкай і на ўзгорку сярод багнаў пабудавалі горад Кляшчэлі.

Пра заснаванне „места каралеўскага" Кляшчэль (каралём польскім тады быў Жыгімонт Стары) захаваўся дакумент ад 1523 года. Віленскі ваявода, жадаючы пашырыць места Кляшчэлі, даў яму хелмінскае права.

Валочная памера ў 1560 г. падзяліла гарадскую зямлю на валокі, моргі і прэнты. Люстрацыя ад 1576 г. падае 385 плацячых падаткі дамоў у Кляшчэлях. Да іх былі прыпісаныя вёскі: Добра Вада (сённяшняя Дабрывада), Трубянка (сёння яна не існуе), Нурэц (цяпер вёска Чаромха) ды Косьная.

У Кляшчэлях быў рынак і 15 вуліц. Вакол горада, на рэчках Нурэц, Елянка (цяпер Арлянка) і Добра Вада працавалі 23 млыны.

Кляшчэлі належалі каралеве Анне, жонцы Стэфана Баторыя. Яна ў 1581 г. дазволіла пабудаваць ратушу ў горадзе. У другой прывілеі каралева аб'явіла: „Дзеля ўстанаўлення ўсялякага ладу, пячаць або герб, якога яны дагэтуль не мелі, даем і назначаем: баранчыка са сцяжком і надпісам sigillum civitatis Klesczeleviensis. Гэтай пячаццю яны павінны карыстацца ў лістах Рэчы Паспалітай, пасведчаннях і для пацвярджэння выдачы і выпісак з кніг гарадской рады і судовых".

Кляшчэлеўская ратуша згарэла ў 1631 годзе.

Пасля шведскай вайны ў Кляшчэлях асталося толькі 13 дамоў (люстрацыя ад 1660 года). У 1662 г. знаходзілася ўсяго 9 вадзяных млыноў. У 1758 г. была ў Кляшчэлях шкляная гута. Пры царкве св. Міколы дзейнічала парафіяльная школа. У ёй на працягу стагоддзяў вучыліся дзеці. У тыя часы ў Кракаўскім універсітэце значыўся студэнт, які пачатковую адукацыю атрымаў у кляшчэлеўскай школе.

Былі арганізаваны школкі ў навакольных сёлах: Дабрывадзе, Дашах, Чаромсе, Кузаве, Сухавольцах. Дзеці вучыліся чытаць і пісаць на царкоўнаславянскай, рускай і польскай мовах, вывучалі арыфметыку ды царкоўныя спевы (справаздача ад 1822 года).

У канцы XVIII стагоддзя ў каралеўскім горадзе Кляшчэлі было 20 вуліц, 279 дамоў, 7 вадзяных млыноў, цагельня, 28 бровараў, 2 карчмы. Толькі адзін дом быў пакрыты чарапіцай і 278 — гонтай. Пражывала 1 888 мужчын і жанчын. Сярод рамеснікаў найбольш было шаўцоў, півавараў, пекараў, ганчароў, краўцоў, млынароў і кавалёў.

Славіліся Кляшчэлі вырошчваннем агуркоў і хмелю. Клешчаляне ў асноўным займаліся сельскай гаспадаркай. **(мох)**

Беларусь пачалі іначай разглядаць

Размова з **АЛЯКСЕЕМ ДЗІКАВІЦКІМ**, карэспандэнтам Радыё Свабода ў Варшаве.

„Ніва": — Калісьці Аляксандр Мілінкевіч сказаў, што дыктатура Аляксандра Лукашэнкі пратрымаецца яшчэ не больш года. Ці Вы згодны з такой думкай?

Аляксей Дзікавіцкі: — Я думаю, шо гэта крыху перабольшванне, але, на маюу думку, гэты рэжым не такі ўжо моцны пасля выбараў. Сітуацыя Беларусі такая, што яна ў пэўным сэнсе заложнік геапалітычнай сітуацыі ў Еўропе. Да пэўнага часу такое было ўражанне, што рэальна Захад, г.зв. „старая Еўропа", не хацеў заўважаць, што адбываецца, бо было ўсё спакойна. Цяпер, калі мы бачым гэты канфлікт з нафтай, калі ўсе вядучыя выданні пісалі пра гэта, калі трэба было закранаць стратэгічныя запасы нафты, гэта ўзняло беларускую праблему на новы ўзровень. Калі сярэдні еўрапеец зразумее, што гэта можа закрануць яго сям'ю, што не зможа заплаціць за паліва, за станцыі, што будзе менш цяпла, тады маем іншую сітуацыю. Ясна, што настрой грамадзян адбіваецца на паводзінах палітыкаў. Памойму, цяпер Беларусь пачалі іначай разглядаць, разглядаць праблему, якая існуе. Захад не бачыць ужо, што Беларусь гэта частка Расіі, што пачнем размаўляць, і ўсё будзе нармальна, будзе газ, нафта і гэтак далей. Цяпер зразумелі, шо гэта не толькі Беларусь і Захад, а Захад — Беларусь — Расія.

— А што Лукашэнка хоча разыграць сваёй барацьбой?

— Скажам прама: Лукашэнку ўдавалася дванаццаць гадоў абдурваць Расію, маніць байкамі пра інтэграцыю, „адмысловыя ўмовы для расійскага бізнесу", пра тое, што „вам дамо, а вы нам давайце амаль што бясплатна нафту ці газ". Мы бачым, што сітуацыя адмянілася. Можа, Лукашэнку няма чаго там шукаць на Крамлі, дык рашыўся на тое, пра што гаварылі „беларускія нацыяналісты" пятнаццаць ці шаснаццаць гадоў таму — пагаварыць пра наша геапалітычнае становішча. Ён проста паказаў, што можа разыграць гэту карту, а Крамлю сказаць — „не хочаце, дык я павярнуся да Захаду". Мэтай гэтага было паказаць сваё значэнне.

Фота Раіны Стэфанчук

— Ці цяпер можна спадзявацца больш рэпрэсій?

— Я думаю, што можна спадзявацца яшчэ больш рэпрэсій. Думаю, што Лукашэнка цяпер будзе разыгрываць карту аб'яднання народа вакол свае асобы. Ворагі ўжо скончыліся. Ужо няма каго вінаваціць у тым, што ў нас дрэнна. Пра гэта казалі апазіцыйныя палітыкі, незалежныя СМІ, даўно: давайце будзем незалежныя, ідзём у Захад, у Еўропу. Дык гэтыя галасы трэба заглушыць. Думаю, што рэпрэсіі толькі ўзмоцняцца.

— А што можа зрабіць беларуская меншасць у Польшчы?

— Мне здаецца, што беларуская меншасць у Польшчы і так дагэтуль шмат рабіла. Радыё, самаўрадавыя кантакты. Нават такія мерапрыемствы, як „Бардаўская восень", „Басовішча". Гэта вялікая для нас дапамога. Не было б гэтага — не было б дзе паказацца беларускім творцам.

— Жывяце ў Варшаве ад пяці гадоў. У апошні год прыкмячалася шмат „скрыгатаў" у функцыянаванні беларускіх студэнтаў у Польшчы. Як ацэньваеце іх сітуацыю?

— Гэта вялікая справа. Мы гаворым пра рэзалюцыі, нейкія жэсты падтрымкі беларускай дэмакратыі, але адзіны ўрад у Сярэдняй Еўропе, які прыняў такую праграму гэта польскі ўрад, які паставіў студэнтаў з Беларусі ў лепшую сітуацыю нават у параўнанні з польскімі студэнтамі. Гэта беспрэцэдэнтная і вялікая рэч. Іншая справа — самое выкананне гэтай справы. Мы былі засмучаныя нейкімі непрыемнымі фактамі. Беларускія спецслужбы не маглі нічога зрабіць для таго, каб знішчыць гэты праект, дыскрэдытаваць яго, каб паказаць, што гэтыя людзі, што вучацца там на Захадзе — ворагі. Калі былі нейкія непрыемныя ньюансы, гэта не сведчыць пра ўсю праграму.

Размаўляла Раіна СТЭФАНЧУК

Крыж пры дарозе

Вёску Старабераза з Дубічамі-Асочнымі за чыгункай, з паўднёвага боку, спалучае шырокая дарога. Можа калісьці быў тут якісьці тракт, па якім можна было выехаць у свет. Шырокую дарогу можна ўбачыць на беразоўскіх палетках, таму што на дубіцкіх яна вужэйшая. Відаць, дубіцкія сяляне дарогу выкарысталі на ўласныя патрэбы. І вось тут, дзе раздзяляюцца палі гэтых вёсак, стаіць каменны крыж. На вярху яго замацаваны жалезны крыж, кавальскай работы. Калісьці, дзе стаіць гэты крыж, прабягала амаль чатырохметровая ўсходняя граніца вёскі Старабераза. А яшчэ раней па гэтай дарозе-граніцы, праходзілі людзі з харугвамі і асвячалі свае палеткі. Гэтая традыцыя загінула ў пяцідзесятыя гады прошлага стагоддзя, калі тадышнія ўлады забаранілі абыходзіць свае палі. І вось ад гэтай пары прапала і дарога, якую проста заараллі. І калі б не гэты крыж, не вядома было б, дзе граніца між палеткамі паасобных вёсак.

Вось аднойчы снежаньскім адвячоркам кажу я жонцы: „Пайду дарогай на граніцу, пад Дубічы-Асочныя. Пагляджу, ці там яшчэ на граніцы крыжык стаіць?"

Пайшоў я сваёй дарогай, амаль паўтара кіламетра ў адзін бок. Здалёк угледзеў крыжык, калі з узгорка спусціўся. Добра, што яшчэ крыжык стаіць. Можа штосьці аб ім даведаюся? Хто яго паставіў і калі гэта было? Адкуль была гэтая добрая душа?

Калі я дайшоў да крыжа, расчараваўся. Час зрабіў сваё. Град, снег, дажджы і навальніцы ўсе веды аб крыжы закрылі. Дзе словы на крыжы былі, толькі месцы ад іх асталіся. Колькі разоў кругом крыжа я хадзіў, не дабіўся нічога. Адно толькі падумаў: „Пэўна з Дубічаў-Асочных была гэтая добрая душа, што крыж паставіла, бо ён да Дубічаў фронтам стаіць. І гэтую мясцовасць як на далоні відаць, а Старабераза ўзгоркам закрытае. І аб крыжы хтосьці ў вёсцы ўспамінаў бы. А то цішыня". А можа я памыляюся? Калі хто аб ім нешта ведае, няхай пару слоў напіша.

Так вось стаіць гэты спрадвечны крыжык адзінока. Каб ён змог загаварыць, аб многіх рэчах пераказаў бы нам: аб войнах, якія наведалі нашы землі, аб ворагах, якія нашых мясцін не абмінулі. Расказаў бы аб долі і нядолі праваслаўных людзей, якія тут жылі і жывуць спакон вякоў. А ён стаіць як верны сторож Хрыстовай веры. Адно толькі словы загінулі таму, што жалезны крыжык на вярху, які ўжо пачарнеў, хтосьці памаляваў сіняй фарбай. Жывуць яшчэ добрыя людзі на нашай беларускай зямлі. Слава ім. Не зважаючы на ўсе перашкоды, крыжык як стаяў, так і стаіць, прыпамінаючы прахожаму аб тым, што тут жывуць праваслаўныя людзі. Прахожыя не аднойчы ля крыжа сядзелі і да Госпада Бога маліліся, прасілі, каб Ён ім сілу паслаў і на час дадому явіцца.

Грыша МАРОЗ

Паўвека разам

У нядзелю, 21 студзеня г.г. у Гміннай управе ў Міхалове (Беластоцкі павет) адбылося ўрачыстае ўручэнне медалёў „За шматгадовае шлюбнае жыццё", прысвоеных ім прэзідэнтам РП. Загадчыца ЗАГСа Зофія Варобей запрасіла адзінаццаць пар. Прыехала дзесяць. На сустрэчу з шаноўнымі юбілярамі прыбылі старшыня Гміннай рады Міхалова Уладзімір Кананчук, войт Міхалоўскай гміны Марк Назарка і сакратар Гміннай управы Станіслаў Малясінскі.

Медалі, дыпломы і кветкі атрымалі: Баляслаў і Антаніна Болтрыкі, Рыгор і Валянціна Дрэвіцкія, Канстанцін і Яўгенія Кузьмы, Уладыслаў і Вера Саковічы ды Аркадзь і Валянціна Ваўранюкі — усе яны з Міхалова, Ян і Яўгенія Парэмскія з Пянькоў, Рышард і Галена Расінскія з Кітурыкаў, Васіль і Раіса Саковічы з Бяндзюгі, Уладзімір і Галена Салавей з Таніцы-Дольнай ды Мікалай і Марыя Усціновічы з Юшкавага Груда.

— Я да самой пенсіі працаваў шаўцом у Міхалове, па вуліцы Гарадоцкай, — сказаў Баляслаў Болтрык. — Мая жонка Антаніна — у швейным прадпрыемстве „Бельпо" ў Міхалове. Ад 1959 года мы жывём у Міхалове. Маем чацвёра дзяцей, дзесяць унукаў і пяць праўнукаў. Вельмі цешымся імі. Сын ды дзве дачкі жывуць таксама ў Міхалове, а яшчэ адна дачка — у Васількаве.

У сувязі са знамянальнай гадавінай у іх жыцці ўсе юбіляры атрымалі самыя шчырыя і сардэчныя пажаданні.

(мох)

Ансамбль „Паазер'е" ў Вроцлаве

19-22 студзеня 2007 года пры садзеянні Пасольства Беларусі ў Польшчы ў Вроцлаве адбыўся шэраг канцэртных выступленняў заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля народнай музыкі „Паазер'е" з г. Паставы.

Беларускі мастацкі калектыў разам з народнымі майстрамі ўпершыню прымаў удзел у традыцыйных мерапрыемствах, арганізаваных Саюзам украінцаў у Польшчы сумесна з Вроцлаўскай грэка-каталіцкай дыяцэзіяй і пры ўдзеле Вроцлаўска-Шчэцінскай праваслаўнай епархіі — XI Вроцлаўскай куцці і V Вроцлаўскіх калядаваннях, якія адбыліся ў клубе ўкраінцаў, касцёле св. Вінцэнта і Вроцлаўскім універсітэце. У мерапрыемствах таксама прымалі ўдзел калектывы з Украіны і Балгарыі, нямецкай і грэ-

часкай меншасцяў у Польшчы.

У канцэртных праграмах прагучалі разнастайныя беларускія народныя песні і музыка, удзельнікі мерапрыемстваў змаглі азнаёміцца з цікавай выстаўкай дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, пачаставацца беларускімі стравамі.

На розных мерапрыемствах прысутнічалі ваявода Вроцлаўскага ваяводства, прэзідэнт Вроцлава, праваслаўны архіепіскап Вроцлаўскі і Шчэцінскі, каталіцкі епіскап Вроцлаўскі, прадстаўнікі дыпламатычных устаноў Балгарыі, Украіны, Грэцыі, саветнік Пасольства Беларусі Тадэвуш Стружэцкі, прадстаўнікі ўкраінскай, нямецкай, балгарскай, грэчаскай меншасцей, пражываючых у Вроцлаве, рэгіянальныя СМІ.

Публіка вельмі цёпла, з авацыямі ўспрыняла выступленні цікавага беларускага музычнага калектыву.

21 студзеня адбылася сустрэча ўдзельнікаў беларускай дэлегацыі з праваслаўным архіепіскапам Вроцлаўскім і Шчэцінскім Іераміяй, іншымі прадстаўнікамі епархіяльнага ўпраўлення, у час якой удзельнікамі ансамбля „Паазер'е" былі выкананы беларускія калядныя песні.

Арганізатары мерапрыемстваў, прадстаўнікі самаўрадавых органаў г. Вроцлава, архіепіскап Вроцлаўскі і Шчэцінскі Іерэмія адзначалі важнасць удзелу творчай дэлегацыі з Беларусі, якая выдатна прадставіла ў час мерапрыемстваў у Вроцлаве беларускую культуру.

Прэс-служба Пасольства Рэспублікі Беларусь

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

— 58 —

Ну, вядома, усе пахварэлі. Гэта ўсё з-за таго, што снегу не было так доўга. Насыпле снегу — „новая атака зімы”, з якой немагчыма справіцца дарожнікам і транспарту, ды і гэтак, што гарады і мястэчкі і людзі разам з імі апынуцца як на Антарктыдзе. А снегу ды марозу няма — усе плачуцца: што ж за зіма такая, што не злепіш снегавіка, не пакатаешся на каньках ці лыжах. А калі яшчэ і зімовыя канікулы на носе! Не магла дачакацца і снегу, і канікул Гражынка. А тут раптам — усе дома. Нікуды яна не паехала, ні з хаты ніхто нават на працу не выбіраецца. Усе злеглі. Апрача Грака і Мікіткі. Мікітка яшчэ ні разу не хварэў — быў, праўда, у лекара, з бабуляй, нават кніжачку атрымаў, але далі яму толькі не зусім балючы ўкол і нейкую салодкую пасту палізаў, прафілактычна, казалі, што ад кашэчага грыпу. А тут грып чалавечы — значыцца, ніхто не браў уколу? А, можа, не грып, а нешта іншае?

— Што ім доктар даў на аздараўленне? Поўныя торбы лякарстваў з'ядаюць, а не ўстаюць? Пагуляць няма з кім...

— Трэба змяніць ім лякарства. Я злятаю да лекара, папытаюся, — адважыўся Грак.

— Ой, не ляці нікуды! За акном так штосьці вые! Свету не відаць. Можа, сам штосьці выдумаеш? Ты вучоны птах, начытаўся ўсяго... Я Гражынку лапкай буду гладзіць... Гэтая самая... аку.. аку... прэсура. А ты...

Грак зірнуў на вялікі альяс — бубулінага гадаванца. Расліна была сапраўды як волат — расла ў цэбрыку, а калючыя тоўстыя лісты аж зіхацелі. Грак адшчыпнуў дзюбай галінку, а з ранкі пацёк клейкі сок.

— Ой, не чапай! Бабуля будзе злавацца! — злякаўся Мікітка. — І кроў у яго цячэ?..

— Зажыве! — Грак ужо ўкідаў у міску наступныя кавалкі альяса і аддзіраў ад мякаці скурку.

Прытэпала бабуля, учуўшы гам на кухні. Мікітка ўжо заплюшчыў вочы: ой, будзе Граку, што так вазон падзёр! А бабуля аж пляснула ў ладкі:

— Ой, Грачок, малайчына! А я ўжо забылася, што маем у хаце такое цуд-лякарства!

Міра ЛУКША

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

— 15 —

У першыя дні зімовых канікул я не магла адаспацца. Апошнія два тыдні перад канцом першага паўгоддзя я лягала спаць пасля поўначы. Раніцай падымалася ў шэсць гадзін і паўтарала яшчэ раз засвоены матэрыял. Мае ацэнкі ўсё ж не задаволілі бацькоў, яны забаранілі мне сустракацца з сябрамі, асабліва з Міколкам ды Ігарам.

Зімовыя канікулы я прывітала ў сумным настроі. Бацькі адправілі мяне да бабулі ў вёску. Я не пратэставала. Наадварот, там у мяне сяброўкі — Віялета і Марта. У бабулі я магу рабіць усё што мне спадабаецца. Летам я езджу на ровары і купаюся ў возеры, зімой хаджу на лыжах, катаюся на каньках або гляджу тэлевізар. Ужо першага дня я пазваніла дзяўчатам:

— Як добра, што ты прыехала, — сказала Марта, — заўтра ў нашага сябры дзень нараджэння. Мы забярэм цябе з сабой. Напэўна будзе весела...

Спачатку я адмаўлялася. Мне не хацелася заводзіць новыя знаёмствы, але бабуля таксама мяне заахвочвала.

— Ідзі, — сказала, — я ў тваім узросце ўжо на танцы хадзіла.

Раніцай я прачнулася ў знакамітым гумары. За акном было бела, якраз уначы выпаў першы снег. У дзесяць гадзін раніцы за мною прыйшлі дзяўчаты. Я хуценька апранулася і мы пайшлі ў суседнюю вёску. Па дарозе я апавядала пра хлапцоў з нашай гімназіі, дзяўчаты — пра сваіх... Цягам гадзіны мы прайшлі пяць кіламетраў, але мы нават не заўважалі як гэты час нам зляцеў.

— Як добра што вы прыйшлі! — прывітала нас мама Адася, сённяшняга юбіляра. Хлопец таксама выйшаў да нас на парог і з захапленнем глянуў на нашу тройку.

— Знаёмцеся, — сказала Віялета.

— Я — Бася Муха, — усміхнулася я.

— А я, — хлопец паціснуў мне руку, — Адам Казлоўскі! Пасля мы танчылі і гулялі на катку.

У пакоі было многа моладзі. Гімназісты пілі кока-колу і ўспаміналі сваіх настаўнікаў. Найбольш нейкага „*Нішчыцеля*”, які паставіў у класе аж сем адзінак.

— А ў вас ёсць такія індывіды? — спытаў мяне Адам.

Я толькі чакала гэтага выкліку. Кампанію найбольш зацікавіў наш... Міколка.

— Давайце напішам яму эсэмэску! — прапанавала Віялета.

Яна першая набрала нумар жуліка і напісала яму прывітанні і некалькі мілых слоўцаў. Міколка адразу адпісаў, ён дамовіўся з нашай сяброўкай яшчэ ў той самы дзень сустрэцца на катку. *Прыйдзі з сяброўкай*, — напісаў ёй.

Ад смеху нам разбалелі жываты. Мы ўяўлялі як Міколка і Ігар выглядаюць дзяўчат у Беластоку, а мы сабе гуляем... дзвесце кіламетраў далей...

тэкст:<natasza99222@wp.pl>
дызайн:<Lolcia05@wp.pl>

Галерэя „Зоркі” (Беласток)

Кінга Смык

Кінга Смык са сваімі медалямі

Кінга Смык вучыцца ў чацвёртым класе Пачатковай школы № 19 на пасёлку Пяста ў Беластоку. Яна — выдатніца, так як і ўвесь яе клас у школе. З першага класа займаецца ў танцавальным гуртку. Паколькі навука даецца ёй лёгка, дык настаўнік перавёў яе ў групы танцораў, якія могуць пахваліцца поспехамі. Зараз Кінга працягвае навучанне ў групе дзетак 4-5 класаў. Навучанне адбываецца два разы на тыдзень па паўтары гадзіны. У групе займаецца пятнаццаць пар. У юных танцораў шмат поспехаў. Часта выступаюць яны на школьных мерапрыемствах і ўдзельнічаюць у шматлікіх конкурсах. Кінга Смык заваявала дагэтуль адну статую і дванаццаць медалёў, у тым ліку сем залатых, тры сярэбраныя і два бронзавыя. Дзяўчынка найбольш любіць лацінаамерыканскія танцы.

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Вершы Віктара Шведа

Выратавальнік

Бацькі і дзеці ў доме адпачынку
Ужо нарэшце маюць вольны час.
Мама знервавана праз хвілінку:
— Не выключыла электрычны прас.

Шкадуе бацька жоначкі каханай,
Прыпомніў ён дамашні балаган:
— Дык не згарыць нам хата нечакана,
Не закрунуў я прад ад'ездам кран.

Апранае бацька сына

Апранае ў прадшколле
Бацька свайго сына.
Не выконваў ніколі
Гэтую павіннасць.

Запытаў потым дзетку:
— Як мая работа?
— Мама раней шкарпэткі
Дае, потым боты.

У СВЯТОЧНАЙ АТМАСФЕРЫ

Сустрэча дзетак I „а” класа з бацькамі, арганізаваная 19 студзеня ў Пачатковай школе н-р 6 у Гайнаўцы, праходзіла ў святочнай атмасферы. Калядкі напаміналі аб мінулым Раждзестве Хрыстовым, а вершыкі падыходзілі да настрою Хрышчэння Гасподняга.

— Мы доўга рыхтаваліся да выступлення перад бацькамі, бо хацелі, каб добра атрымалася нашае калядаванне, — кажа класная настаўніца Гражына Паўлючук, якая разам з настаўніцамі беларускай мовы ладзіць у школе сустрэчы, што напамінаюць пра даўнія вясковыя традыцыі. — Гвяздачкі прынеслі ў школу бацькі, якія абклейвалі іх дома разам з дзеткамі, а ёлка прыбраная была яшчэ перад святамі Раждзества Хрыстовага.

Калядавалі ўсе дзеткі

Паміж калядкамі дзеткі выступалі з вершыкамі (на першым плане Ганя Хомчук)

За выступленнямі наглядалі бацькі і малодшыя сямейнікі вучняў (справа Гражына Паўлючук і намеснік дырэктара Ала Дзмітрук)

Дзеткі I „а” класа вучацца ў вялікай школе толькі з верасня мінулага года, але паспелі ўжо добра пазнаёміцца. Выдатная большасць бацькоў рашылася запісаць дачок і сыноў на заняткі беларускай мовы, якія вядзе настаўніца Беата Кендысь.

— Нашы дзеткі любяць хадзіць на заняткі па беларускай мове. Вучацца яны спяваць цікавыя песні і гаварыць вершыкі. Мы рады, што паслалі сваю дачку, каб вучылася беларускай мове, — заяўляе Анна Хомчук.

— На занятках беларускай мовы многа гульняў і спеву, а гэта дзеткі любяць. Мой Бартэк ахвотна вучыцца па-беларуску, — кажа Ева Васілюк. Не менш ахвотна дзеткі ходзяць на заняткі з класным настаўнікам Гражынай Паўлючук.

У час калядавання дзеткі выступалі таксама з беларускімі калядкамі і вершыкамі. Настаўніца раіла, каб хлопчыкі і дзяўчаткі выступаючы індывідуальна глядзелі на сваіх бацькоў.

— Для мамаў і бацькоў найпрыгажэйшыя свае дзеткі і на іх выступленні яны глядзяць з самай вялікай увагай, — кажа настаўніца Гражына Паўлючук. — Я раздала бацькам лістоўкі са зместам калядак, каб маглі яны калядаваць супольна з дзеткамі. Я апасалася, што самім вучням можа не атрымацца спеў і патрэбная будзе падтрымка з боку старэйшых. Аднак дзеткі зрабілі мне прыемную неспадзяванку і заспявалі намнога лепш, чым у час рэпетыцый.

Дзеткі выступалі ажно з 5 прыгожымі гвяздачкамі і сапраўды вельмі ўдала атрымлівалася ў іх калядаванне. Вучні гаварылі вершыкі і звярталіся да сваіх бацькоў з традыцыйнымі святочнымі пажаданнямі. Узамен атрымалі цукеркі. На сценах класнага кабінета віселі ручнікі з народнымі ўзорамі, якіх у школу прынеслі бацькі.

— Нашы бацькі многа дапамагаюць школе. Ужо прынеслі ў нашу рэгіянальную залу макаткі, ікону і вырабы народнага рукадзелля, — інфармуе настаўніца Гражына Паўлючук, якая апякуецца гэтай залай разам з настаўніцамі беларускай мовы. — Дзеткі першага класа таксама знаёмяцца са старымі прыладамі працы. Пасля будзем праводзіць урокі сярод тканых вырабаў і рукадзелля. Я на сваіх занятках стараюся таксама адзывацца да дзетак па-свойму. Рады яны, калі загавару да іх на семяноўскай гутарцы. Можа некаторых хлопчыкаў і дзяўчатак вучаць гаварыць па-свойму бабулі на вёсках.

У сустрэчы вучняў з бацькамі прымала ўдзел таксама намеснік дырэктара школы Ала Дзмітрук. Пасля выступаў дзетак іх настаўніца Гражына Паўлючук расказала пра вучобу ў першым паўгоддзі і раздала бацькам пісьмовую інфармацыю пра поспехі паасобных вучняў. Гаварыла яна таксама пра пазаўрочныя спатканні, выезд дзетак у Беласток і пра адпачынак ля вогнішча. Бацькам трэба было ацэньваць сваіх дзетак на асобных лістоўках.

— Відаць, што бацькі падобна як я ацэньваюць сваіх дачок і сыноў, — заявіла настаўніца.

Бацькі паабяцалі дапамагаць школе і разышліся ў святочным настроі.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Польска-беларуская крыжаванка № 5



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 1: Абраз, клас, раса, рысунак, каток, міна, боб, маток, кары, Ас. Краб, глыток, асоба, сук, мы, брама, ракіта, Ас, нос, замак.

Узнагароды, **каляровыя алоўкі з тачылкай для алоўкаў**, выйгралі: **Дыяна Капытка, Юстына Анішчук, Наталля Янцэвіч, Паўліна Башун** з Чыжоў, **Ася Нявінская, Марта Трашчотка, Павел Дэмбоўскі, Пятрусь Герасімюк** з Бельска-Падляшскага, **Магда Куптэль** з Гайнаўкі, **Рафал Скепка** з Дубін, **Эвеліна Лемеш** з Орлі. **Віншуем!**

З нашаніўскай парой

Раённыя элімінацыі XIII выпуску Алімпіяды беларускай мовы, якія 18 студзеня адбыліся ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, праходзілі пад знакам нашаніўскай пары. Белліцэісты ў сваіх пісьмовых працах часта спасылаліся на публікацыі ў „Нашай ніве" і „Нашай долі". Некаторыя вучні пісалі пра сваю Малую айчыну — Беласточчыну. У вусных адказах ліцэісты завяралі аб прывязанасці да мясцовых абрадаў і традыцый, а некаторыя белліцэісты заклікалі сваіх сябраў трымацца роднай мовы і не саромецца беларускай нацыянальнасці.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Перад вуснымі адказамі многа вучняў яшчэ паўтарала пройдзены матэрыял

Рады тэмам алімпіяды

Арганізатары алімпіяды — Кафедра беларусістыкі Варшаўскага універсітэта і Таварыства Польшча-Усход — многа ўвагі адвялі нашаніўскаму перыяду, што вучні ўспрынялі станоўча.

— У 1906 годзе пачалі выходзіць газеты „Нашая доля" і „Нашая ніва". Калі ў мінулым годзе рыхтаваліся матэрыялы да алімпіяды, святкавалі мы стагоддзе з дня заснавання згаданых мною газет і мы рашыліся адзначыць гэтую падзею, — заявіў прафесар Аляксандр Баршчэўскі, мерытарычны кіраўнік алімпіяды.

Большасць маіх суразмоўцаў пісала пра грамадскае, нацыянальнае і літаратурнае значэнне „Нашай долі" і „Нашай нівы". Накірунак працы з літаратурай і публікацыямі нашаніўскай пары быў вядомы для белліцэістаў загадзя, калі сталі даступныя вучням інфармацыйныя матэрыялы для падрыхтоўкі да сёлетняга выпуску алімпіяды.

— Я рашылася пісаць на тэму „Нашай долі" і „Нашай нівы". Звярнула я ўвагу на адраджэнне беларускіх нацыянальных ідэй пад уздзеяннем гэтых газет. Часопісы гэтыя мелі вялікі ўплыў на фармаванне нацыянальнай свядомасці беларусаў, але і экспанавалі рэвалюцыйныя ідэі, — заявіла Маргарыта Кулік. Агата Кердалевіч, якая выбрала тую ж самую тэму, дабаўляе, што „Наша доля" і „Наша ніва" інтэгравалі беларускае асяроддзе і спрычыняліся да развіцця беларускага школьніцтва. Частка вучняў рашылася пісаць пра творчасць Янкі Купалы нашаніўскай пары.

— Пераклад тэксту з беларускай мовы на польскую не быў цяжкім і лёгкімі спачатку паказаліся пытанні па граматыцы. Аднак я пасля заўважыла, што ёсць там закавычкі, з якімі я магла не справіцца. У пісьмовай працы я звярнула ўвагу на нацыянальныя пытанні ў творчасці Янкі Купалы, — сказала Барбара Трафімюк і расказала пра актуальныя нацыянальныя пытанні сярод яе сяброў. — У наш белліцэй найчасцей прыходзяць дзеці беларусаў. Частка іх лічыць сябе беларусамі. Аднак нашы вучні ў асноўным размаўляюць паміж сабой на польскай мове. У белліцэі я гавару па-свойму з сяброўкамі з вёсак, бо гайнаўскія вучні ў асноўным ужо не ўмеюць добра гаварыць на мове сваіх бацькоў. Я думаю, што сваю мову трэба высмактаць з маміным малаком і бацькі павінны з ранняга дзяцінства гаварыць са сваімі дзеткамі на роднай мове, бо пасля цяжка ўжо іх навучыць добра гаварыць па-свойму.

Вучні маглі многа напісаць на трэцюю тэму „Усходняя Беласточчына — мая Малая айчына".

— Пішучы пра нашу Беласточчыну, я звярнула ўвагу на прыгожыя месцы, якімі мы можам ганарыцца. Я жыву ў Елянцы і мне падабаюцца нашыя родныя краявіды, — заявіла Аня Баравік.

Захаваць сваю мову, культуру і традыцыю

Перад вуснымі адказамі вучні цягнулі білеты з пытаннямі. Перад трыма конкурснымі камісіямі белліцэісты адказвалі на пытанні па ўсёй беларускай літаратуры і расказвалі пра мясцовыя абрады, традыцыі і беларускую культуру ў вёсках.

— На білетах ёсць таксама пытанні пра сям'ю і Белавежскую пушчу. Мы будзем пытаць вучняў, як яны ацэньваюць уваход Польшчы ў Еўрасаюз і ці бачаць сваю будучыню ў Польшчы, ці можа за межамі нашай краіны. Ёсць таксама філасофскае пытанне наконт сэнсу жыцця або пытанне пра суадносіны паміж дзяцьмі і бацькамі, — сказаў яшчэ перад вуснымі адказамі прафесар Аляксандр Баршчэўскі.

— Мой вусны адказ тычыўся галоўных мэтаў, да якіх я буду імкнуцца ў маім жыцці. Я планую закончыць вышэйшую адукацыю, ажаніцца і выхоўваць сваіх дзяцей у беларускай атмасферы. Я хацеў бы, каб мае дзеці ўмелі гаварыць на сваёй мове, каб ведалі нашы традыцыі, абрады і беларускую культуру. Сярод маіх сябраў вельмі мала асоб умее беззаганна гаварыць на нашай дыялектнай мове. Штораз больш нашых вучняў ведаюць сваю мову ў абмежаванай ступені. Яны не гавораць па-свойму, бо апасаюцца, што з-за малога запасу слоў у іх гутарка не атрымаецца. Калі яны дома не гавораць з бацькамі па-свойму, для іх дыялектная мова не з'яўляецца натуральнай, — тлумачыў Андрэй Грыгарук. Яго сяброўка Магдаліна Аўксеціюк гаварыла пра праявы беларускасці ў сваёй школе і звярнула ўвагу, між іншым, на заняткі па беларускай мове, абсталяванне кабінетаў гэтага прадмета, беларускія сімвалы і насценгазеткі на калідорах. Сказала яна таксама пра настаўнікаў Гайнаўскага белліцэя, якія звяртаюцца да вучняў па-беларуску або па-свойму і гавораць пра беларускія справы.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У гэтым годзе многа белліцэістаў адказвала на пытанні не звязаныя непасрэдна з беларускай літаратурай (на першым плане Норберт Аркадзь Васілюк)

Норберт Аркадзь Васілюк расказваў пра духоўнае багацце беларусаў Падляшша.

— Я звярнуў увагу на наш фальклор і багатую абраднасць. Гаварыў пра рэйды беларускай моладзі, якая нядаўна збірала па вёсках фальклор. Я сам прымаў удзел у гэтых рэйдах, якія добра ўспамінаю. Вельмі важная справа — гэта захаванне нашай спадчыны, традыцыі і культуры. Мы, беларусы, павінны памятаць, што наша культура розніцца ад польскай. Нам трэба ганарыцца сваёй спадчынай, а не забываць яе. Наш фальклор і культура вельмі прыгожыя і дапамагаюць разбудзіць у нас нацыянальную свядомасць. Адметная традыцыя і праваслаўнае веравызнанне аб'ядноўваюць беларусаў у Польшчы, — сказаў Аркадзь Васілюк. Юліта Сушч у час вуснага адказу станоўча ацаніла рашэнне польскіх улад аб прыёме ў нашы вышэйшыя ўстановы студэнтаў з Рэспублікі Беларусь. Гаварыла яна пра сяброўства паміж студэнтамі з Польшчы і Беларусі і знаёмства з культурай суседзяў.

З дапамогай настаўнікаў

У Гайнаўскім белліцэі ажно 130 вучняў прыступіла да школьных элімінацый алімпіяды і 28 з іх ліку перайшло да акруговых элімінацый.

— У нашым ліцэі да алімпіяды масава прыступаюць вучні трэціх класаў, але сярод удзельнікаў ёсць таксама малодшыя вучні. Спатыкаючыся з вучнямі, я дапамагаю ім знайсці патрэбную літаратуру і матэрыялы па граматыцы. Мы таксама паўтараем пройдзены матэрыял, — заявіў настаўнік беларускай мовы Гайнаўскага белліцэя Ян Карчэўскі, якога многа вучняў перайшло да раённых элімінацый.

У Бельскім белліцэі да школьных змаганняў прыступіла намнога менш вучняў, чым у Гайнаўцы і таму да раённага выпуску перайшло толькі 15 асоб.

— Мы з верасня ладзім дадатковыя заняткі, на якія прыходзяць вучні, што пасля плануюць удзельнічаць у алімпіядзе. У гэтым школьным годзе не ўсе ліцэісты, якія хадзілі на нашы заняткі, прыступілі да алімпіяды. Некаторыя вучні дайшлі да вываду, што не справяцца з матэрыялам, які трэба паўтараць і адмовіліся ад удзелу ў Алімпіядзе беларускай мовы, — сказала настаўніца беларускай мовы з Бельскага белліцэя Анна Бжазоўская. — Мы, настаўнікі беларускай мовы, памагаем вучням паўтараць матэрыял па беларускай літаратуры і граматыцы. Вучым пісання пісьмовых прац і вусных адказаў. Сустрэчы два разы ў тыдні даюць магчымасць многаму навучыцца.

Аляксей МАРОЗ

* * *

Нядаўна газета „Жэчпасполіта" змясціла вынікі IX Агульнапольскага рэйтынгу сярэдніх школ, арганізаванага „Жэчпасполітай" і часопісам „Перспектывы". Чарговы раз на высокіх месцах сярод сярэдніх школ Польшчы апынуліся белліцэі з Бельска-Падляшскага (41 месца) і Гайнаўкі (42 месца). У саставе сярэдніх школ з Падляшскага ваяводства, якія змагаліся ў рэйтынгу, Бельскі ліцэй апынуўся на чацвёртым месцы, а Гайнаўскі — на пятым. Апярэдзілі нашы белліцэі толькі Першыя агульнаадукацыйныя ліцэі з Беластока, Сувалкаў і Ломжы. Школы ацэньваліся толькі на падставе поспехаў вучняў, прымаючых удзел у прадметных алімпіядах. Бельскі і Гайнаўскі белліцэі апынуліся на высокіх месцах дзякуючы поспехам у трох алімпіядах. Аднак найбольш на поспех запрацавалі вучні, якія перамаглі менавіта на Алімпіядзе беларускай мовы. Сёлетнія пераможцы беларускай алімпіяды таксама падымуць прэстыж сваіх школ, працуючы на добрыя вынікі ў рэйтынгу, які будзе абвешчаны праз год.

Альбом Меляшкі

Павел Гжэсь, чапляючы фатаграфіі на платы і сцены дамоў, змяніў асуджаную на знікненне памежную вёску ў адну вялікую галерэю пад адкрытым небам. Усе Меляшкі сталі мастацкім творам — людзі, архітэктура, гісторыя і сацыяльныя сувязі. Сам праект маладога фотадакументаліста, якога род выводіцца з гэтай старажытнай вёскі на Гарадоцкай зямлі, зварухнуў асяроддзе, ажывіў мясцовасць, ускалыхнуў эмоцыі, аднавіў памяць. Пасля славутай выставы праект завяршыўся фотаальбомам, якога выдаўцом з'яўляецца Гмінны асяродак культуры ў Гарадку, а друкаваўся ён у Кракаве. Словам аздобілі яго вядомы мастак Лявон Тарасэвіч, якога матчын род таксама бярэ вытокі з Меляшкоў, Кшыштаф Чыжэўскі з Асяродка „Пагранічча" і Тамаш Посьпех. Публікацыю сфінансавалі са сродкаў Еўрапейскага фонду рэгіянальнага развіцця ў рамках Праграмы суседства Польшча — Беларусь — Украіна INTERREG IIIA/TACIS CBS 2004-2006 і з дзяржаўнага бюджэту ў рамках Згуртавання „Еўрарэгіён Нёман". Выданне — выключна да бясплатнага распаўсюджвання.

Кшыштаф Чыжэўскі разважае: „Стаяць у абдымках — маці і сын. Ён прыехаў з горада. Яна ў горад выязджаць не хоча. Лепей ёй у драўлянай хатцы з ганкам, дзе на франтоне ашчэпкі дошак укладваюцца ў біблейны радок: Дзе ўсходзіць сонца і кудэма знікае... Яму, здаецца, каштоўнае тое, што мае куды вяртацца... Здымак зроблены фотаапаратам фірмы «Bronica», сярэднефарматным (6 х 6 см), без аніякай аўтаматыкі, з чорна-белага негатыва. Можна яго сканіраваць, рабіць адбіткі ў розных памерах, але найпершая выява — велічыні аднаго квадратнага метра, апраўленая ў драўляныя рамы і павешаная ў прасторы жыцця, не ў галерэі, а на плоце ля дому...

Павел Гжэсь запамятаў месца і людзей з гадоў, калі быў падшпаркам. Калі жыла яшчэ бабуля, да якой любіў прыязджаць з Гарадка. Вучыўся ў школах у Гарадку і ў Беластоку. Дарастаючы, ездзіў па найбліжэйшай ваколіцы — да мастака Лёніка ў Валілы або Сенькі ў Бельск. Свядомы беларус. Цяпер — студэнт Інстытута творчай фатаграфіі Шлёнскага універсітэта ў чэшскай Апаве і інфарматыкі Варшаўскага політэхнічнага інстытута..."

Вывеў людзей Павел Гжэсь — бабуль, дзядуль, маладзейшых хоць ужо таксама пажылых, унукаў, дзенідзе пабралі яны з сабою свайго коціка ці сабаку, перад хаты. У будні дзень ліпнёвы ці жнівеньскі, яны і святочна апрануты, як да здымка, са святам у душы — Меляшкі важныя будуць, і мы разам з імі, незабытыя — і ў будзённай апратцы. „Усё адбываецца ў вёсцы Меляшкі, ля польска-беларускай мяжы, на старадаўнім шляху з Гродна ў Бельск. Ад XVI стагоддзя прыналежных Хадкевічам — знакамітаму роду Вялікага княства Літоўскага, што ўмеў спалучаць адданасць беларускай мове і традыцыі з цывілізацыйным развіццём. Сёння засталося 87 хатаў, у некаторых людзі жывуць толькі летам. А калісь Меляшкі кармілі замак у Гарадку..." Даў ім хвалу і пачуццё сваёй вартасці. Заслужылі на хвіліну ўвагі. Гэта свята і для іхняй душы, і мастаковай. Галерэя пад адкрытым небам, не зачыненая ў сценах. Гэта было важнае і Паўлу Гжэсю: вяртаннне да сябе, усведамленне спадчыны, непадманная ідэнтыфікацыя з родным, пачатак шляху з моцай за плячыма. Не толькі, дарэчы, і яму, бо і Лявону Тарасэвічу. Бы той першы „зорчын" крыж, якога ініцыятарам быў Лёнік, а Паўлік быў сярод дзятвы, якая той меляшкоўскі мадэрны і з традыцыйнымі святымі лікамі размалёўвала. Ён жа і штогод вяртаўся да таго крыжа, а меляшкоўцы ля яго сталі ладзіць святы, яднацца. Каля сваіх хатаў з „антычнымі франтонамі". „Ікона сялянскай хаты — сэнс існавання" — піша Лявон. Гэтае Месца было пачаткам бачання і ўявы — як той вобраз каня, што прасіў дзед Міхал у Лёніка, каб яму намаляваў. „І тая мова, якая гучала ўсюды і ўсюды — здавалася, што ўвесь свет так гаворыць, нават Маці Божая і Хрыстос". І загаманілі былі людзі на старажытнай брукаванцы па-свойму, ідучы паўз сваёй галерэі — акуратных платоў з абразамі простых лікаў.

(лук)

Вока на ўсход

Размова з рэжысёрам Ірынеем ПРАКАПЮКОМ

(працяг; пачатак у 4 нумары)

Ілона Карпюк: ***Чаму новы фільм называецца „Акно на ўсход"?***

Ірыней Пракапюк: — Таму што гэта такое... хаця ў Яблачынскім манастыры растлумачылі нам, што мяжа ёсць толькі арбітральная, па абодвух баках мяжы размаўляюць на такой самай мове, а ментальная мяжа цягнецца ад Балтыйскага мора да Карпатаў.

— ***Мне здавалася, што размовы часцей вяліся пра закрыццё мяжы, загаловак падказвае другое?***

— ... той загаловак добра пасаваў... штось у ім ёсць... а што, кепскі? *(смех)*

— ***Гэтага я не сказала...***

— Нам спадабаўся, падкрэслівае ён, што гэта Усходняя сцяна. Гэта цікавая мяжа, на захадзе было б паіншаму, там проста ёсць нармальнасць.

— ***А тут лакальны каларыт, фальклор.***

— Так, гэта адно, але і розныя рэлігіі, нацыянальнасці, зусім розныя асобы.

— ***Што Цябе яшчэ цікавіць, якія тэмы паявяцца ў Тваім незалежным кіно?***

— Цяпер яшчэ гэтая Беларусь не дае мне спаць...

— ***Вось, чаму Ты паехаў на прэзідэнцкія выбары?***

— Каб не асацыявалі мяне з адной роляй, вясковымі тэмамі. А Еўрасаюз? Да гэтага не вярнуся, няма ўжо сэнсу, але з вёскай бывае парознаму, напрыклад, фільм „Дзівадла"... адна баба другой, сяброўка сяброўцы, аказваецца, што дзесьці штось ёсць, то мы ўзялі камеру. Хто ведае, можа штось з гэтага атрымаецца. Паехалі, былі нават у хатцы, дзе нібыта начавала малпа, усё здавалася жартам, да моманту калі лакальны аўтарытэт, праф. Сімона Косак не сцвердзіла, што гэта праўдападобнае. Ага, калі так, дык варта тое змантаваць, такім чынам паўстала добра ўспрыманае „Дзівадла".

— ***Ад „Дзівадла" да дзіўнай джынсавай рэвалюцыі...***

— А так, рэвалюцыя. Каб вырвацца з вёскі, выйсці насупраць важнай тэмы, палітычнай, але і звязанай з маладымі людзьмі. Я ўвогуле хацеў бы рабіць фільмы пра нас, пра сябе, пра тое што нас баліць, з чым змагаемся. З тым, з чым і ты змагаешся.

— ***Што так баліць?***

— Найважнейшае — праца. Чаму трэба выязджаць? Часам можа і гэта добра, але калі выязджаеш і хочаш жыць нармальна, не эканомячы кожнага фунта ці еўра, не зможаш. Частка гэта вылічнікі, якія там маюць крыху грошай, а тут пэўна не мелі б нават працы. А калі тут вяртаюцца, цяжка ім прывыкнуць да 1 000 зл. у месяц, якія там зарабляюць у... тыдзень. Пару спраў тут кепска сарганізаваных.

— ***Пра што расказвалі Табе маладыя беларусы ў Мінску?***

— Ад страчанай любові да патрэбы змен на лепшае ў краіне. Я жыў з трыма студэнтамі, я — чацвёрты. Адзін смяяўся, што нічога не зменіцца, я з вамі, але не пайду, гэта не аплачваецца. Другі — ваяўнік, друкаваў лістоўкі, перакананы і свядомы. Трэці? Мастак, нібыта з іншага свету, але і быў на Кастрычніцкай плошчы. Я глядзеў на іхнія перамены, бачыў, як зніжаецца ўзровень энергіі, калі стомленыя вяртаюцца пасля цэлай ночы, тры пары штаноў... рэвалюцыя спынілася і толькі ўсяго.

— ***А тэхніка працы?***

— Камеру трымаў я часта ў рукаве, кішэні, частка здымкаў была паварушаных, страх, што хтосьці затрымае. У мяне не было акрэдытацыі, з рашэннем адносна выезду чакаў я да апошняга моманту. Аказалася, што якраз з турыстычнай візай было лягчэй, але глупствам было б паказвацца на ўсе бакі. Меў я адзін кантроль, але камеры не заўважылі.

— ***З якімі пачуццямі Ты вярнуўся?***

— Добра, што вярнуўся. Так сабе думаю, тыя маладыя робяць дакладна тое ж самае, што нашы бацькі ў час ваеннага становішча, перажываюць... Можа праз дваццаць гадоў будуць пры ўладзе як прыхільнікі чарговых станоўчых змен. Але так, папраўдзе, што мы ведаем пра Беларусь? Помню, калі рыхтаваў я карэспандэнцыю для радыё ТОК ФМ. Звоняць і пытаюцца ці карэспандэнцыя ўжо гатовая, а я кажу ім: „Дайце мне пятнаццаць хвілін, сяджу ў піцэрыі". Усе разрагаталіся: у Мінску піцэрыя! Я сам раней быў там з дзесяць гадоў таму і бачу аднак мноства пазітыўных змен. Згода, ёсць і дысанансы, як у метро — серп, молат, а побач сучасныя маніторы з рэкламамі. Але мушу сказаць, што адчуваў я сябе бяспечна. Ад гэтай шэрасці чалавек аднак сумнее. Я не хацеў бы там жыць. Тут таксама не. Патрабую больш сонца.

— ***Падаешся ў эміграцыю?***

— Пакуль што не.

— ***А якія тут перспектывы ў маладых людзей?***

— Здаецца ёсць зялёнае святло. Калі хочаш, сочыш за сваімі справамі, прабуеш, тады ўдасца. Мы так робім.

Гутарыла Ілона КАРПЮК



http://arkushy.narod.ru

Нацыянальна-патрыятычныя памкненні сучаснай беларускай моладзі ў паўсядзённым жыцці не вельмі заўважальныя. Далёка не кожнаму хопіць смеласці альбо проста жадання выйсці на нейкую маніфестацыю, стаць у пікет альбо паўдзельнічаць у флэш-мобе. У той жа час праявіць сябе можна праз Інтэрнэт, які дазваляе ў спакойнай абстаноўцы распавесці аб сваіх думках, выніках уласнай працы і творчасці. Зразумела, калі гэтыя меркаванні і справы вартыя таго, каб пра іх паведамляць усяму свету.

Адным з прыкладаў такога карыснага для азнаямлення сайта можна назваць асабісты віртуальны рэсурс Змітрака Кузменкі. Сайт носіць вельмі рамантычную назву: „Сьвіслацкія аркушы" і месціцца па адрасе http://arkushy.narod.ru.

На першы погляд Інтэрнэт-партал выглядае даволі просценька. Белашэра-чырвоныя колеры, якія пераважаюць на ім, характэрныя для сайтаў незалежніцка-дэмакратычнай накіраванасці. Таму і сайт Змітрака Кузменкі адразу настройвае віртуальнага наведвальніка на даную тэматыку. І гэта не падаецца арыгінальным. Затое арыгінальным падаецца змест партала. Але аб ім крыху ніжэй.

Першая старонка сайта не надта інфармацыйная. Акрамя назвы сайта, герба Пагоня і некаторых іншых абавязковых аздабленняў, кшталту выйсцяў да рубрык, даведацца пра што менавіта хоча распавесці аўтар вельмі цяжка. Так, выява фотаздымка Кастуся Каліноўскага і некаторы расповед аб новай рубрыцы пра змагара стварае толькі цьмянае разуменне, што сайт мае літаратурна-мастацкую і гістарычную скіраванасць.

Рубрыкі, выйсці да якіх знаходзяцца злева, якраз раскрываюць перад намі літаратурна-мастацкую частку дзейнасці Змітрака Кузменкі. Тут месцяцца вершы, балады, байкі і публіцыстычныя нататкі. Варта адзначыць, што яны ўражваюць сваёй глыбінёй асэнсавання ўзнятай тэмы, шматбаковаму погляду на той ці іншы бок рэчаіснасці. Нездарма аўтар быў пераможцам конкурсу „Дэбют-98" па Першамайскім раёне г. Мінска. Друкаваўся ў часопісе „Першацвет", газетах „Вячэрні Мінск", „Літаратура і мастацтва".

Але найбольшым захапленнем Змітрака Кузменкі ёсць даследаванне жыцця і дзейнасці вялікага беларуса — Кастуся Каліноўскага, імя якога і сёння натхняе прагрэсіўныя сілы Беларусі да адстойвання дэмакратычных каштоўнасцей і ідэі нацыянальнага адраджэння. Дастаткова ўзгадаць неіснуючую на афіцыйных картах Мінска „Плошчу Каліноўскага".

Каб выйсці на спецыяльны раздзел сайта, які ёсць свайго роду падсайтам, трэба клікнуць на вышэйзгаданы здымак змагара на першай старонцы. Тады колер сайта змяняецца на жоўта-карычневы, які дае адчуванне старадаўнасці падзей, у цэнтры якіх і знаходзіўся Кастусь Каліноўскі.

Змітрок Кузменка з 2002 года займаецца ўлюбёнай справай і ўжо назапашыў шмат звестак аб беларускім героі. Каб у гэтым упэўніцца, дастаткова зазірнуць на рубрыкі гэтага падсайта, назвы якіх гавораць самі за сябе — „К. Каліноўскі", „Паўстанне", „Храналогія", „Постаці", „Архіў". У іх дэтальна апісваюцца ўсе перыяды жыцця змагара, ягоныя паплечнікі, ход паўстання 1863-1864 гадоў.

Аўтарам сабраная вялікая колькасць матэрыялаў па данай тэме. Але даследаванні на гэтым не спыняюцца і Змітрок Кузменка запрашае да супрацоўніцтва іншых зацікаўленых і неабыякавых да сваёй гісторыі людзей.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Сляпая воля і трэнерская доля

Багатым на падзеі для беларускага хакея выдаўся першы месяц новага года. Тут і сенсацыйная перамога „Юнацтва" ў Кантынентальным кубку, і фіяска моладзевай зборнай, і матчы „зорак" (латвійскай і беларускай лігаў, а пасля мінскай „All Stars" і каманды „астатняга беларускага свету"), і громападобная сярод чыстага неба заява пра аб'яднанне трох сталічных каманд. А апошняй „бомбай" стала зусім нечаканая адстаўка галоўнага трэнера мінскага „Дынама" славака Любаміра Покавіча. Клуб „Дынама" быў адроджаны з нябыту перш за ўсё высілкамі кіраўніцтва Міністэрства ўнутраных спраў і канкрэтна яго кіраўніка Уладзіміра Навумава, які ўзначальвае беларускую федэрацыю хакея. У мінулым чэмпіянаце змаганне за золата ішло якраз паміж „Дынама" і „Юнацтвам", якое трэніруе Міхаіл Захараў, асоба таксама „набліжаная да імператара". Летась стаўкі „Дынама" выглядалі не менш высока, але фінальную серыю ўпэўнена выйгралі „захараўцы". Толькі Покавічу, які ў цэлым пацвердзіў сваю прафесійную здольнасць, прыгадалі тую паразу чамусьці толькі цяпер. Пераемнікам славака на капітанскім мосціку стаў Эдуард Занкавец, з якім некаторыя з ветэранаў-дынамаўцаў яшчэ разам гулялі. Дзіўная замена, таму што „Дынама" выступала зусім няблага, а фармулёўкай „за нізкае відовішча гульні" наўрад ці можна растлумачыць такую адстаўку.

А можа кіраўніцтва хакейнага „Дынама" пастанавіла браць прыклад з прэзідэнта футбольнага „Дынама" Юрыя Чыжа. Той мяняе трэнераў кожны чэмпіянат, а часам і два разы ў сезон. Вось і сёлета „бела-блакітныя" пачалі год з новым камандорам — „на патэльню" на гэты раз адважыўся Пётр Качура. Футбольныя канікулы былі багатыя на чарговыя змены рулявых. Зноў вярнуўся ў Беларусь знакаміты і непрадказальны Эдуард Малафееў — цяпер ён будзе трэніраваць сталічны МТЗ. Яшчэ адзін былы трэнер нацыянальнай беларускай дружыны Анатоль Байдачны ўзначаліў ждановіцкую „Дарыду". А Анатоль Юрэвіч будзе працаваць з „Гомелем". Найпазней жа з галоўным настаўнікам вызначылася кіраўніцтва гродзенскага „Нёмана" — днямі ім стаў Людас Румбуціс. Вось так і ходзяць трэнеры па коле — з каманды ў каманду. А між тым жыццё выразна паказвае, што поспеху ў беларускім футболе дасягаюць тыя спецыялісты, якім даюць спакойна працаваць прынамсі трыцатыры сезоны. Яскравым прыкладам таму — барысаўскі БАТЭ, самая тытулаваная каманда апошняга дзесяцігоддзя. Адваротную праяву можна назіраць з тым самым гродзенскім „Нёманам". Складаецца ўражанне, што чыноўнікі наўмысна развальваюць гульнёвыя каманды ў горадзе над Нёманам. У хакейнай камандзе амаль няма сваіх выхаванцаў, а пра футбольную і гаварыць не хочацца — бясконцыя перамены і адно суцэльнае расчараванне. Старыя прыхільнікі клуба, па-сутнасці, перастаюць нават хадзіць на гульні. Ужо зараз можна ўпэўнена прагназаваць, што Румбуціса чакае тое самае, што і яго папярэдніка Уладзіміра Курнева — у „Нёмане" ён затрымаецца ненадоўга. Сляпая воля кіраўніцтва вызначае трэнерскую долю.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Белы конь гэта наша жыццё

Прачытаў я аповесць Міхася Андрасюка „Белы конь" і хачу падзяліцца з чытачамі „Нівы" ўражаннямі ад гэтай кніжкі. А чытанне гэтай кніжкі не з лёгкіх задач, трэба яе чытаць дакладна і з розумам, бо дзеецца тут шмат новага і цікавага. Аповесць з дзевяці частак, а кожная з іх магла б быць асобным апавяданнем, але злучаюць яе героі з адной сям'і, недзе з-пад Гайнаўкі, ад Белавежскай пушчы.

Чаму аўтар даў такі амаль казачны загаловак — „Белы конь"? Белы конь у нашых былінах сімвалізуе поўнае подзвігаў гераічнае жыццё; і толькі на белым кані маглі ездзіць народныя рыцары і каралі. А ці мы такіх не мелі? Мелі, але ці ў будучыні будзем мець? Гэта залежыць ад нас і час пакажа тую будучыню. Я турбуюся за яе, бо не чую нашай гаворкі з вуснаў нашай школьнай амаль ужо гарадской моладзі, а ніхто ж горш чалавеку не зробіць апрача яго самога.

Калі нават белы конь прысніцца ў снах, гэта абазначае ўдачу і поспех, а ўжо вараны абазначае смерць. Унікнем у сюжэт кніжкі, ці не так яно ёсць. Дзед Уладзімір, будучы гаспадаром і кучарам пана Драгабыцкага, вазіў яго ўсюды, і на кірмаш у Кляшчэлі праз Войнаўку, Палічну і Курашава ў брычцы, у якую запрагаў белага каня Султана; тады ўсё адбывалася гладка і нармальна. І калі нават пана не стала, калі бальшавікі, нахлынуўшы да нас восенню 1939 года, люта з ім расправіліся і расстралялі, дык і тады дзед духам не ўпаў, бо апорай і сілай ягонай гаспадаркі быў надалей белы Султан. А калі вызваліцелі завіталі да нас у другі раз, калі гналі немцаў на захад, дык яны забілі старога каня Султана і з апетытам яго з'елі. Узамен дзед атрымаў ад народнай улады ў рамках амерыканскай дапамогі новага каня, смалянога, якога і назвалі Унрам, дык мала ім нацешыўся, бо ў час арання новы конь капытам забіў свайго гаспадара. Так было б і з намі, калі б мы трапілі пад капыт савецкага акупанта, дык той чужы конь сваім капытам адправіў бы і нас на той свет.

У кніжцы Андрасюка ўжо спачатку вылучаецца граніца, якая адмежавала не толькі тэрыторыю, але і наш лёс. Калі сёння слухаю тэлеперадачы з замежжа, дык моташна робіцца, калі чуеш, што там быццам вялікая нацыя, дзе амаль усе беларусы чырыкаюць па-расійску. Помню, калі я яшчэ быў дзецюком, дык нашы людзі паціху гаварылі пра тую граніцу, што яе за Старыной мералі і перамервалі. Тады вёску Бабінку падзялілі напалову і пра гэта дакладна піша спадар Андрасюк. Тады за самагонку многія савецкія чыны гатовы былі прадаць роднага бацьку і маці. Але ў нашым выпадку самагонка выратавала многіх, бо дазволіла застацца на нашым баку, без Сібіры, Варкуты, далёкай поўначы і цвёрдай рукі Сталіна.

Наш аўтар аснаваў сюжэт вакол лёсу беларускай сям'і з наваколля Старыны і Войнаўкі. Бабулька Сонька, ужо ўдава, але заўсёды жвавая і рашучая, выбіраецца са сваімі дзяцьмі ў найбліжэйшае мястэчка; мне здаецца, што была гэта Гайнаўка. Там з дапамогай знаёмых змайстравала перавезеную хацінку і ўладкавалася нейкім чынам на вакансію бліжэй партыі, дзе не вельмі прыглядаліся адукацыі, цанілі толькі каб заўсёды аддана ісці з ветрам. А мы, як народ без айчыны, вельмі ж падатлівыя на такія хады. І тут вось аўтар, на прыкладзе Соньчыных сыноў, хоча паказаць наш характар, нашы звычкі, нашы козыры і слабасці, наша стаўленне да роднай мовы і гісторыі. Бо кожны з нас меў у сям'і такіх менавіта людзей, як Соньчыны сыны; аднымі можам ганарыцца, іншымі крыху менш, а яшчэ пра іншых дык шкада і згадваць. Гэтаксама і Сонька магла ганарыцца і хваліцца добрымі паводзінамі сваіх сыноў і сумаваць калі вялі сябе неразумна; гэтаксама і мы адносімся да сваіх нашчадкаў.

Сын Ваня, так як і многія ў нас у час народнай улады, хацеў выбіцца ў людзі, уступіў у партыю і, можна сказаць, дабіўся нейкага поспеху, бо ўдалося яму вырваць з турмы брата Колю, які ехаўшы на матацыкле пасля п'янкі прывёў да выпадку. Але жыццё Вані было шэрае і нецікавае, як і ва ўсіх кар'ерыстаў. Коля мала ў чым адрозніваўся ад Вані, дурное каханне пераблытала ягоны лёс а кропку над і паставіла гарэлка.

Антон стаў сталяром і, як піша аўтар, абмінаў спакусы вялікага свету, зрэдку заглядаў у кілішак, але яго таксама пагубіла г.зв. вялікае, але няшчырае каханне нейкай Гандзі, бо яна прапала як цень на вадзе. Нельга забываць і пра карліка Сашку, якога аўтар чамусьці называе дзядзькам, мо таму, што гэта малаважная постаць. Бо такое было і ягонае жыццё і калі ён памёр не паводле чалавечай натуры дык ніхто яго вельмі і не шкадаваў апрача аднаго прайдзісвета Булы. І ў нас калісьці быў чалавек, якога называлі такой мянушкай, які ў 1970-я гады выбраўся ў мястэчка і там самотна памёр па старасці. Астаўся яшчэ дзядзька Валодзя, сын Сонькі з нейкім панічам; так бывала ў нашых прыгожых дзяўчат, калі намі правілі паны, да таго ж з роду Сапегаў, а так было з Сонькай і яе сынам Валодзем. А гераіня аповесці Сонька адышла ў сакавіку, не так даўно, перажыўшы мужа Уладзіміра на звыш трыццаць гадоў і няхай зямелька стане пухам над яе магілай.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Стараберазоўскі абыход палёў

Стараберазова распаложанае ў сярэдзіне сваіх палеткаў, якія маюць форму квадрата. А гэта дзякуючы людзям, якія землямеру, калі той мераў палі для вёскі, далі хабар — жывога барана. Як з гэтага відаць, хабарніцтва цягнецца даўным-даўно, толькі тады ніхто з гэтым не ваяваў. Таму вось так выглядаюць нашы палеткі. З паўднёвага боку граніца нашых палёў прабягае пад самымі будынкамі вёскі Махнатае (пэўна сяляне гэтай вёскі хабару не далі). З усходу знаходзіцца вёска Дубічы-Асочныя, з захаду — Збуч, з поўначы — невялікае Шастакова. І калі хто гаварыў пра свой палетак, дык казаў: пад Махнатым, ад Дубічаў, каля Збуча, каля Шастакова. А вось у гэтых палеткаў былі мясцовыя назвы: *Лугі, Глубокі Роў, Катэлец, Брытан, Міжыдарожэ, Пярэдній Выпуст, Задній Выпуст, Маргі, Дубовый Луг, Ляды, Крыніца, Бакоўка, Асяродак, Пярэдняя Альхоўка, Задняя Альхоўка, Равок, Вузкая Локніца, Шырокая Локніца і Крыначка.* Такія назвы палеткаў цягнуцца ад вякоў. Некаторыя з іх пасуюць да рэльефу, а сэнсу іншых цяжка здагадацца. Да чаго можа пасаваць *Брытан* ці *Катэлец*? Невядома і ніхто ўжо толкам не растлумачыць.

У кожнай вёсцы былі цікавыя абрады. Варта прыпомніць вясковыя працэсіі, гэтак званыя абыходы палёў з харугвамі і з іконамі. Да гэтага свята рыхтавалася ўся вёска. Гаспадыні пяклі пірагі і смачную ежу рыхтавалі. У сам дзень свята ў царкву ішлі. Бацюшка маліўся за вёску і прыхаджан. Потым бралі харугвы, іконы і ішлі абыходзіць палі. Калісьці такі абрад можна было рабіць без праблемаў, таму што кругом палеткаў пралягала амаль чатырохметровая дарога, па якой не толькі можна было прайсці, а нават смела праехаць.

Пасля літургіі людзі пачыналі абыход палёў. Калі падыходзілі да сваіх участкаў станавілася на калені і бацюшка маліўся над імі, асвячаў поле і жадаў добрага ўраджаю. Калі набліжаўся поўдзень, сядалі на полі крыху перакусіць. Заўсёды гэта было на *Задняй Альхоўцы*. Сядалі на зялёнай траўцы і крыху перакусілі. А потым далей ішлі. Тады лягчэй ішлося і галасней спявалася. Памятаю аб гэтым, бо сам я ішоў, несучы маленькую іконачку, прыціскаючы яе да грудзей.

Хрэсны ход у Стараберазове — 12 мая 1930 г.

Пасля абыходу палёў людзі пераходзілі ў вёску. Насупраць кожнага панадворка гаспадар выносіў стол, а гаспадыня накрывала яго прыгожым ільняным абрусом і клала хлеб ды соль. Сям'я чакала бацюшку. Бацюшка маліўся за сям'ю і свянціў свянцонаю вадою. Абыходы цягнуліся да самага адвячорка.

Вечарам пачыналася супольнае гасцяванне, якое цягнулася ўсю ноч. Толькі пакуль прысутнічаў бацюшка, усё ішло па меры спакойна, а калі бацюшку адвезлі на плябанію, тады пачыналася сапраўднае свята. Калі людзі падвыпілі, чуваць было вясёлы гоман і прыгожыя песні. А ў нас прыгожа спявалі, былі звонкія галасы. І калі была нагода спяваць, дык спявалі. А як трэба было папрацаваць, не цураліся працы. Такое святкаванне канчалася танцамі пры гармоніку.

Толькі шкада аднаго, што ў пяцідзесятых гадах улады забаранілі абыходзіць палі. Чагосьці баяліся. А можа прыклад бралі з Усходу? Усялякімі спосабамі праследавалі тады рэлігію. Так загінуў гэты абрад. Цяпер цяжка яго вярнуць. Наш пан сахі дарогу навокал палёў заараў, асталася вузкая баразна, па якой не то што праехаць, а нават і прайсці немагчыма. Некаторыя вёскі гэтую традыцыю працягваюць толькі ў царкве. Толькі што гэта ўжо не тое самае. А пачастункі і танцы адышлі ў няпамяць. Так што пры нашым жыцці многа абрадаў прапала. А шкада.

Грыша МАРОЗ

Пажаданні

Кшыштафу Сяргеюку
народжанаму 10 лютага 1989 года
ў вёсцы Паўлы, Заблудаўскай гміны

Бацька, маці ды сястра
Бабці, дзядзькі, цёткі —
Усе жадаюць Табе шчасця
У васемнаццатыя ўгодкі.

Каб заўжды здаровы быў,
Сваім жыццём весяліўся,
Куды б лёс Цябе не кінуў —
Сваёй раднёй ганарыўся.

А ў школе па навуцы
Заўжды меў шасцёркі.
Каб яснае жыццё было,
Як на небе зоркі.

І Царкву шануй, сынок,
Хадзіць у храм не забывай,
Часта, шчыра там маліся,
Паклон Богу аддавай.

Як дастанеш гаспадарку,
Будзеш панам на сваім,
Шануй родную зямельку,
Бо яна — як маці ўсім.

Добрую пару каб знайшоў
І каб з ёю павянчаўся,
На парозе і ў пасцелі
З ёй ніколі не спрачаўся.

Яшчэ раз Табе жадаем
Усяго, што толькі можам,
Каб пражыў Ты сто гадоў
Пад апекай Божай!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

„Ніва" квітнее

Калі я атрымаў „Ніву" ад 31 снежня мінулага года, з календаром, не паверыў вачам, што наша газета будзе цяпер выходзіць у каляровым выглядзе, як папулярныя журналы. Але ці гэта толькі так калярова з календаром, ці ўжо далей так астанецца?

Усяго найлепшага журналістам і карэспандэнтам „Нівы" ў новым, 2007 годзе!

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

ЗАХАВАЦЬ ПАМЯЦЬ

— Тут, на гэтым узгорку, могільнік знаходзіўся, — тлумачыць Кацярына Цэтра

Пра стары могільнік у Шарнях Арлянскай гміны гаварыў мне жыхар Маліннікаў Пятро Нічыпарук. Суразмоўца заўважыў, што могільнікам ніхто не апякуецца і знаходзіцца ён у дрэнным стане. Гэта падштурхнула мяне паехаць у Шарні. Нагода для падарожжа надарылася 16 студзеня, калі з Міколам Ваўранюкам паехалі мы ў Маліннікі да Надзеі Сахарчук, дзе ён здымаў сюжэты для тэлеперадачы „Беларускі тыдзень". У час размовы намякнуў я пра могільнік у Шарнях. Наша субяседніца параіла заехаць да яе сваячніцы Кацярыны.

— Яе сядзіба мяжуе з могільнікам, — удакладніла цётка Надзя. — Яна гісторыю могільніка ведае...

З Маліннік у Шарні рукой падаць. Паколькі я ўпершыню ехаў у гэтую вёску, дарогу шафёру паказваў Мікола Ваўранюк. Спыніліся мы пры канцы вёскі каля невялічкай хаткі. Бабуля на панадворку з зацікаўленнем глядзела ў наш бок. Калі я выявіў мэту свайго падарожжа і тое, што па рэкамендацыі сваячніцы з Маліннік прыходжу, 77-гадовая Кацярына Цэтра сказала:

— Могільнік вунь там знаходзіцца, — і паказала кіёчкам у напрамку сумежнага хваёвага маладняку. — На машыне можаце туды пад'ехаць. За святліцай у правы бок павярніце.

Пакуль мы на машыне пад'ехалі, бабуля да нашай кампаніі падыходзіла праз сваё загуменне.

— Тут даўней быў вясковы могільнік, — тлумачыла нам бабулька Кацярына. — Старажылы ўжо не памятаюць, калі хавалі тут нябожчыкаў; сто, мо дзвесце гадоў таму. Магілкі з зямлёю зраўняліся. Месца зааралі і хваінай яно парастае. Толькі спарахнелыя крыжы і валуны-помнікі напамінаюць, што калісьці могільнік тут быў.

Кацярына Цэтра гаварыла яшчэ, што непадалёк гэтага месца, паміж Пашкоўшчынай і Шарнямі, знаходзілася царква. Паводле легенды, царква сквозь зямлю праваліласа. Зараз захавалася адно назва ўрочышча — *Царкоўніска*. Колькі ў гэтым праўды, дык цяжка сказаць. Адно здаецца быць пэўным, што жыхары вёскі павінны захаваць памяць аб старым могільніку як помніку даўніны і хаця б раз у год, у дзень памінання памерлых, разам са сваім настаяцелем памаліцца на гэтым месцы.

Тэкст і фота
Уладзіміра СІДАРУКА

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2007 r. upływa 5 marca 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 884 egz.

Я за Польшчу ад мора да мора!

У рэдакцыю неспадзявана завітаў **Кшыштаф Кананові́ч** — кандыдат у прэзідэнты РП. *„Пэўна будзе весці выбарчую агітацыю? Мабыць, прынёс нейкую прапанову беларусам?"* — падумалі мы.

— Proszę zrobić trzy odbitki? — кандыдат у прэзідэнты дастаў са сваёй скураной сумкі фактуру і даў яе галоўнаму рэдактару, які якраз знаходзіўся ў прыёмнай.

— Proszę bardzo! — шэф уключыў ксеракс і стаў капіраваць дакумент...

— A to za darmo? — спытаў госць.

— Tak, za darmo.

— To proszę cztery razy...

Ці гэта была палітычная ігра з боку кандыдата — ці звычайная памылка (у суседнім будынку знаходзіцца ксераксны паслуговы пункт) — мы не высвятлялі. Кшыштаф Кананові́ч з ходу згадзіўся даць нам інтэрв'ю:

Ганна Кандрацюк: — ***Можам размаўляць па беларуску?***

Кшыштаф Кананові́ч: — Так, можам.

— ***А, дзе Вы навучыліся размаўляць па-беларуску?***

— У нас у хаце размаўлялі па-беларуску, *па-просту*, значыць. Усе: тата, мама, дзед, баба. Наша сям'я з-пад Гродна, з вёскі Стральцы. Там жывуць сваякі. Раз я заехаў да іх і пайшоў з хлопцамі на забаву. Ідзем, размаўляем — як з Вамі цяпер, а яны кажуць: „Ты, Кшыштаф, наш чалавек?!" Не, кажу ім, я паляк.

— ***... Э! То пэўна таму Вы нежанаты. Можа, каб не рэзалі пана, пазнаёміліся б з нейкай дзяўчынай. Прэзідэнту трэба ж мець жонку!***

— Цяпер за мной дзяўчаты шалеюць як халера! Адна варшавянка, дачка важнага чалавека (пан Кшыштаф адзначыў, што не назаве яе прозвішча, бо гэта можа пашкодзіць дзяўчыне), сама прапанавала мне шлюб. Яна і маладзейшая крыху за мяне... Заехаў я ў Варшаву, а яна кажа: „Możem się pobrać". То я гавару ёй: „Я цябе не знаю! Не так хутка!" А яна мне: „Але я цябе добра знаю, бачыла ў тэлевізары, бачыла ў газеце..." Мяне цяпер усюды запрашаюць — і ў Амерыку, у Маскву да Пуціна. Каралева Англіі хоча са мной сустрэцца, але я не магу далёка ад'ехаць ад хаты, мама нагу паламала, ляжыць і трэба ёю апекавацца. Так што цяпер у мяне адно кароткія паездкі: у Варшаву, Ясьвілы, Сямятычы...

— ***Гэта Ваш штаб агранізуе сустрэчы?***

— Не, нас усюды запрашаюць, людзі дасылаюць мне віншаванні, пішуць каб я імі *жондзіў!*

— ***Вы самі часта паўтараеце, што хочаце жондзіць — бо ў Вас ёсць веды? Якая ў Вас адукацыя?***

— Я закончыў прафесійную школу, маю курсы *паляча*, камп'ютэрныя курсы. Я ведаю на чым палітка *палягае*, калі трэба пайсці на руку, а калі астацца пры сваім...

Фота Ганны Кандрацюк

— ***Што абяцаеце сваім будучым выбаршчыкам?***

— Што навяду парадак, буду ваяваць з гарэлкай, наркотыкамі, папяросамі...

— ***О, то пэўна калі з'яўляецеся на базарыку на Юравецкай, то гандляры нелегальным спіртам і папяросамі ўцякаюць перад Вамі як зайцы перад паляўнічым?***

— Не, я іх не чапаю, хай *паляке* сабе гандлюць. Я за тым, каб не было гіпермаркетаў, таму што яны не нашы, а амерыканскія. А папяросы і гарэлку павінны забіраць на граніцы.

— ***І тады ўсё будзе добра?***

— Яшчэ памяняю Сейм і Сенат, а як хто ў мяне падпадзе — не буду з ім цацкацца. Вось нядаўна, на маю просьбу, памянялі беластоцкага ваяводу?

— ***Значыць, ужо Вы „шэрая эмінэнцыя"?***

— Я толькі падаў заяву міністру Зялінскаму і ён прыехаў у Беласток і памяняў Дабжынскага на Пашкоўскага Багдана. Гэты *наразе* мне не падпаў, а як што — дык і ён паляціць да Лапацка-Пясэцкага...

— ***А што гэта значыць?***

— Лапацка-Пясэцкі — гэта той, што *завалюе* людзей!

— ***О-го! А нашу „Ніву" пакінеце?***

— *Застанаўлюсо* яшчэ ці „Ніва" будзе. Можа зраблю адну газету, будзе называцца „Гродзенская праўда".

— ***Значыць, адначасова хочаце жондзіць і Беларуссю?***

— Я за Польшчу ад мора да мора. Беларусь не будзе называцца Беларусь, толькі *повят Гродна, ваяводства Беласток*. Там нашы яблыкі растуць!

— ***Ці ў Вашым штабе ёсць яшчэ перасяленцы з Беларусі?***

— Чатырох. Шэф штаба Адам Чэчатковіч таксама з Беларусі.

— ***Хочаце ваяваць з Беларуссю?***

— Не, я супраць вайны. Бог сказаў — не забівай! Беларусь далучу да Польшчы добраахотна, Лукашэнку пастаўлю дырэктарам фабрыкі. Ушаную кожную веру, бо Бог адзін. У мяне няма, што адзін лепшы — а адзін горшы! *Папеж* усіх шанаваў, і мурынаў, і ўсіх.

— ***Вам падабаецца прэзідэнт Беларусі?***

— Ён на адно мне падабаецца — што трымае ўсё цвёрдай рукой. Але калі сустрэнемся, я скажу яму, каб ён не душыў палякаў... Я скажу, каб рускія, украінцы і *паляке* былі ў яго роўныя... Як калісь.

— ***Колькі Вам гадоў?***

— Я з 1963 года нараджэння, малады яшчэ — 21 студзеня быў мой дзень нараджэння.

— ***Значыць, Вы нарадзіліся ў Польшчы?***

У Кентшыне. Там мае бацькі мелі гаспадарку, але як маці захварэла, доктар сказаў тату: „Выбірай — або жана, або зямля?" І тады мы пакінулі гаспадарку і мама купіла дом у Старасельцах і з 1975 года жывём у Беластоку.

— ***З чаго ўтрымоўваецеся?***

— Я ўжо 13 гадоў беспрацоўны, а цяпер маю пенсію.

— ***Дзяржаўную — інвалідную?***

— Не, людзі даюць, хто кашульку купіць, хто за размову заплаціць...

— ***Вам гэта падабаецца?***

— Мяне выбраў Бог, каб ісці ў прэзідэнты. Маю такія знакі з неба...

— ***А што мама кажа пра Вашу палітыку?***

— *Цешыццо*, бо цяпер я слаўны на цэлы свет.

— ***Ну добра, а як Вы апранецеся на сустрэчу з англійскай каралевай?***

— Не ведаю. Хай вырашае Адам Чэчатковіч. Бо цяпер мой швэдрык пад ключом. І алярм *прыставяны* да шафы, дзе ён схаваны. Надта ж каштоўны ён зрабіўся.

— ***А колькі ўжо каштуе турэцкі швэдрык, якога ў Польшчы называюць швэдрам Кананові́ча?***

— Я і не ведаю... Надта ж каштоўны ён зрабіўся.

Гутарыла Ганна КАНДРАЦЮК

04.02 – 10.02

Баран (22.03. — 20.04.) Праблемы, у якія сам укапаешся. Не ідзі наперагонкі з кімсьці на працы. Іначай глянеш на партнёра. Цяпло і адданне ў каханні. Марс спрыяе ў кар'еры (увесь месяц).

Бык (21.04. — 21.05.) Нервовасць, паспешлівасць, прага змен. Не рабі нічога на цяп-ляп. З 9.02. можаш аформіць пару спраў ключавых для твайго жыцця. Трымайся за кішэнь.

Блізняты (22.05. — 21.06.) Закахаешся ў асобе, якая была дагэтуль тваёй добрай знаёмай. Не забывай аб прозе жыцця — асабліва аб непагашаных даўгах. У інтарэсах часовы застой.

Рак (22.06. — 23.07.) Знакаміты настрой, радасць, спор у інтарэсах. Ва ўсіх справах разлічвай на партнёра — добра на гэтым выйдзеш. А зоркі дбаюць, каб грошай хапала!

Леў (24.07. — 23.08.) З 8.02. цяжка дасягнуць мэты. Не парывайся на тое, на чым можаш паламаць косці. Рыхтуецца гарачы раман. Шмат працы, абавязкаў, ды не разлічвай на вялікі заробак.

Дзева (24.08. — 23.09.) Дагаворышся з усімі. Самота табе не пагражае. Поўныя кішэні. Аформіш усе справы, з якімі іншыя не справіліся.

Шалі (24.09. — 23.10.) Усе ля тваіх ног — не мусіш спецыяльна старацца. І ў фінансах няблага. Атрымаеш шанц, каб падзарабіць. Апека кіраўніцтва. Будзеш здаровы і прыгожы. 7-10.02. будзеш мець вялікі апетыт; не папраўся занадта!

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Будзь больш таямнічы — хутчэй трапіш камусьці ў вока. І фартуна цябе не падвядзе, будзь толькі цярплівы. Рамантычны настрой. Не будзеш залішне прадуктыўны на працы, ды начальства паглядзіць на гэта праз пальцы.

Стралец (23.11. — 22.12.) Будзеш адчуваць сябе як кароль жыцця. 7-10.02. будзеш мець нагоды паказаць сваю сілу, умеласці, кіраўнічыя здольнасці. Зважай на сваё лакомства! Можаш сустрэць каханне свайго жыцця.

Казярог (23.12. — 20.01.) Добрыя адносіны з суседзямі, сям'ёй. Хату можаш пакінуць на знаёмых і спакойна ехаць у водпуск. З 8.02. можаш змерацца са сваімі абмежаваннямі; пагадзіся з гэтым, што сам не ў змозе змяніць.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Многа энергіі ад зорак. Не эксперыментуй з „цудоўнымі" прэпаратамі, бо можаш нават страціць здароўе. 5-9.02. як снег на галаву можа зваліцца на цябе шалёнае каханне; шкада, што можа яно быць кароткахвіліннае.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Будзеш кампанейскі, вясёлы, дасціпны, веды лёгка ўваходзяць у тваю галаву. Хоць фізічная кандыцыя ненайлепшая. Кар'еры вялікай не зробіш, ды грошай хопіць.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне: народную пагаворку.

1. агульнапрыняты парадак, правілы, што даўно ўкараніліся ў быце народа або ў пэўнай грамадскай групе = 27 _ 28 _ 17 _ 5 _ 26 _ 18 _;
2. апрацаванае пад сяўбу або засеянае поле = 19 _ 22 _ 23 _ 24 _;
3. не дзень = 13 _ 2 _ 1 _;
4. не шах і не мат = 10 _ 9 _ 4 _;
5. кароткі перапынак = 25 _ 29 _ 30 _ 12 _ 11 _;
6. вочы коле = 21 _ 3 _ 20 _ 15 _ 16 _ 14 _;
7. поласць паміж верхняй і ніжняй сківіцамі, якая мае адтуліну ў ніжняй частцы твару = 7 _ 6 _ 8 _.

(ш)

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27	28	29	30

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 52 нумара

Азія, выхад, гісторыя, дзяцюк, крывіч, Осла, цівун, ціпка, Цна, цюль, цюцька.

Рашэнне: **Людзі як цвікі: выходзяць са строю калі крывяцца і пачынаюць гнуцца.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

ISSN 0546-1960

Ігнат Грынявіцкі - II

Ніва
ПРА МІНУЛАЕ

Пра „кудзельнікаў" - IV

Руская статыстыка 1863 года

Здавалася б, Студзеньскае паўстанне 1863 года даўно даследавана ўздоўж і ўпоперак — як з нацыянальна-рамантычнай, так з рэалістычнай пазіцыі. Створаны, і потым абвергнуты, усе магчымыя міфы і легенды... Але неяк па-за ўвагай тое, што пакінулі ў архівах „першыя гісторыкі" таго паўстання... паліцэйскія і жандарскія „муравьёвские офицеры", а менавіта іх пратаколы, акты, справаздачы і табліцы пісаліся дэ-факта, „не стараясь угодить" ні сучаснікам, ні нашчадкам, таму што чалавек жыве толькі адно жыццё, чамусьці ўпэўнены, што крыптанім „совершенно секретно" гарантуе „вечную таямніцу" і для таго піша так званую „голую праўду", піша сабе і ні пра што больш не думае.

„Окончание мятежа" было абвешчана маніфестам імператара Аляксандра II у сярэдзіне 1864 года, калі перад тым у Вільні павесілі „правінцыйнага дыктатара" Каліноўскага, а ў Варшаве „апошняга дыктатара" падпалкоўніка Траўгута. У падуладных графу М. Мураўёву турмах Ковенскай, Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў „не сидели, но стояли", як гэта акрэсліў у мемуарах бліжэйшы ў Вільні памочнік Мараўёва генерал Пётр Чарэвін. „Наша польская шляхта" перажыла ў 1863 годзе тое, што ў пазнейшыя часы Сталіна ў беларускай мове замацавалася як „хапун", альбо павальныя арышты нават не за данос ці падазрэнне, але... „паводле прыналежнасці", напрыклад, да маладой шляхты „без определённого занятия" ў тым ці іншым „мяцежным павеце", a propos, папольску паўсюдны „хапун" чамусьці сарамліва называецца ўсяго толькі odpowiedzialność zbiorowa, як быццам каго хочуць абяліць і выгарадзіць, з тых нелюдзяў і паліцаяў...

Дзеля прасцейшай і хуткай работы судоў, граф... паяднаў арышт, следства, суд і высылку ці забойства ў адных руках, а яго афіцэры — Чарэвін, Ратч, Лосеў — распрацавалі адпаведную методыку з простымі і яснымі інструкцыямі. Па-першае, следчы афіцэр сам адзін вырашаў пра арыштаванага па даносу (!) „вінаваты" ці „невінаваты", таму што... ілжывых даносаў (і контрданосаў) прыходзілася дваццаць супраць аднаго — „наш сціплы народ" любіць зводзіць свае парахункі чужымі рукамі ў крыві па локаць. Па-другое, калі памыліўся сам рускі афіцэр... яго ніхто не папраўляў, нават граф, ні ў той бок, ні ў другі — так рабілася самаўхваленне „русского ума и благородства", гэта раз так „эти полячишки и хамские рыла" мелі запомніць раз назаўжды, што „господин начальник всегда прав", гэта два. Патрэцяе, усе разнастайныя „преступления" былі раскладзеныя... толькі на чатыры параграфы — не па складу „злачынства", а па ступені кары: па-першае, „повешение"; па-другое, „вечная каторга" ці „вечная высылка"; па-трэцяе, простая „высылка" ад 5 да 20 гадоў, пры гэтым альбо „в места отдалённые", альбо не бліжэй Томска ў Сібіры, ці за далёкі Байкал, альбо „в места не столь отдалённые", на Урал ці падуральскую Вятку, а нават яшчэ бліжэй; нарэшце, па-чацвёртае, „условное (!) наказание в особых случаях", альбо для даносчыкаў, „важных асобаў"... і для ўласных паліцэйскіх правакацый.

Герб Студзеньскага паўстання

„Военно-полевые аудиториаты" (суды) складаліся з аднаго афіцэра і двух памочнікаў, і на аднаго асуджанага гэтыя „тройки" звычайна трацілі... не больш дзесяці хвілін, абы акт напісаць і лішні раз пераправерыць, таго судзім ці не таго! Лёгка заўважыць, што „сістэма Мураўёва" не проста без асаблівых пераменаў, але да дробязяў у абрадзе (!), як тыя „тройки", была выкарыстаная Дзяржынскім у ВЧК-ОГПУ, а за ім Сталіным у НКВД-МГБ. А мы дагэтуль усё дзелім „бязбожны камунізм", „бедны рускі народ" і „вялікую рускую культуру"... Мяне асабіста „просто умиляет" пан Ежы Памяноўскі і яго „Новая Польшча", бо той пан ніяк не хоча паслухаць, як самі рускія бачаць сваё месца ў сусвеце — „у нас есть Пушкин, у нас есть Большой Театр, у нас есть ядерное оружие" — то Пушкіна і Bolshoj пан Ежы бачыць, а сілы, хамства і напляваецельства на сваё і чужое жыццё бачыць не хоча, а яшчэ ў самога Гедройца вучыўся... Але вернемся да „мураўёўскай статыстыкі", якая на 1 студзеня 1866 года, калі графа выперлі ў адстаўку „на пенсион", выглядала наступным чынам:

Форма кары	Лік пакараных
I) павешанне	127
II а) вечная катарга	857
II б) вечная высылка на Сібір	512
III) высылка ў Вятку ад 5 ад 20 гадоў	11 956
IV) асуджаныя адмоўна	112
Р а з а м:	13 564

Здавалася б, страты „гістарычнай Літвы", альбо тых абшараў, дзе сучасная Літоўская Рэспубліка і Рэспубліка Беларусь, „не такія ўжо і вялікія", але так можа здацца на першы погляд, пра што будзе пазней... Кожная статыстыка, нават судовая, няпоўная. Напрыклад, я так і не разабраўся, куды аднесці слесара-чыгуначніка з Вільні, якога выслалі... „в работы на Черноморском флоте" (!), альбо яшчэ лепей, ажно восем стралкоў з „брыгады Врублеўскага", егераў Сакольскай лясной школы і да таго схопленых са зброяй у руках, якіх распіхалі „в солдаты пехотных полков на восемь лет" — адзін трапіў нават у Лейб-гвардыі Маскоўскі полк, у „другую сталіцу" і царскую ахову! — і гэта тых самых стралкоў, якія стралялі ў рускую армію пад Саколкай і Бельскам... Ці ў рускіх левая палова галавы не ладзіла з правай, ці наадварот, паколькі „в России всегда не хватало людей", то афіцэры абыходзіліся па-гаспадарску і не прапускалі ні слесара для флоту, ні егераў-інструктараў для арміі. А былі і зусім іншыя прыклады „русского благородства"...

У Ваўкавыску шляхецкая ўдава 43-х гадоў — жыла ў чужым доме на жаласную пенсію і ўтрымлівала дзвюх дачок — была высланая ў Томскую губерню на дваццаць гадоў (пункт II б), а толькі за тое, што „збірала бялізну, бінты, муку і сала" для партызанаў брыгады Лянкевіча. Хіба тут злосць на падпалкоўніка Лянкевіча з рускага афіцэра палезла, бо той падпалкоўнік і рускім солі на хвост насыпаў, і брыгаду вывеў з Налібоцкай пушчы ажно ў Свентакшыскія горы, і самога так і не злапалі...

А нейкі „Радивилл" — адно прозвішча ў акце, ні імя, ні ўзросту, нічога больш, ідзі разбяры, каторы то Радзівіл — нейкі Радзівіл быў асуджаны... „в вечную каторгу" за тое, што „дал сборщику денег сто пятьдесят рублей". Вось сядзі ў архіве і думай, ці сам Радзівіл нахаміў следчаму, ці той афіцэр „брезгливо поморщился", маўляў, у нас галодныя салдацікі паднявольныя жыццё кладуць за цара-бацюшку, а ты „полторы сотни целковых отстегнул, не поскупился, а ещё Радивилл, а ещё князь!.." Зрэшты, сляды „таямнічага Радзівіла" губляюцца, не вярнуўся найхутчэй ён з Байкала, не выкупілі сваякі кланавыя, з нейкіх сваіх прычынаў і кланавых парахункаў. Чаго ў нас не бывае, хоць бы графа Солтана для прыкладу ўзяць, тым болей, той граф да гісторыі сусветна вядомых Крынак прычыніўся...

Станіслаў Солтан перад паўстаннем быў выбраны маршалак шляхты Гродзенскага павета і адначасова быў... „мировой посредник" (суддзя па цывільных справах) у рускай адміністрацыі таго ж Гродзенскага павета. У жніўні 1862 года адстаўны палкоўнік Аляксандр фон Ліпхарт кінуў на збунтаваныя Крынкі роту свайго былога Наваладажскага пяхотнага палка, у выніку чаго... адзінаццаць крынчанаў прапалі без вестак, а гэты Солтан замест таго, каб па сваёй службе „разрешить спор", ехаў конна побач з Ліпхартам і распараджаўся той пацыфікацыяй. Але ў справе „Гродненской революціонной организации 1863 года" той самы Солтан фігуруе як... „гражданский начальник Гродненского уезда", за што асуджаны, як няўдалы Радзівіл, па пункту II а „в вечную каторгу". Але ў 1863 годзе (!) той жа Станіслаў Солтан... ізноў маршалак шляхты і „мировой судья", ізноў у Крынках ды ізноў з Ліпхартам разам камбінуе „отрезки", альбо надзяляе крынчанаў зямлёй згодна з царскім маніфестам, і каб Ліпхарта прытым менш пакрыўдзіць, ясная справа... Солтана „высылалі на Байкал, а выслалі ў Вятку", і вярнуўся ён імгненна, ужо „пасля першай амністыі" 1867 года. Вось што могуць людзі, якія маюць знаёмствы і грошы...

З самых розных „именных списков", напрыклад, той жа Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі, вынікае, што на дзесяць „расшыфраваных" і асуджаных падпольнікаў прыпадае, прынамсі, адзін-два „убитых в бою" і яшчэ два-тры „скрывшихся за границей", ці „от следствия", ці па шчырым прызнанні самога следчага афіцэра, „неизвестно куда"... Ясна, што тых, каго не злапалі і не забілі, было нашмат больш зусім невядомых рускім, чым імі „расшыфраваных". Колькі менавіта, цяжка сказаць... Статыстыку забітых і пацыфікаваных рускія не вялі — каб схаваць „военные преступления", асабліва казацкія рабункі і гвалты. Згаданы ўжо генерал Пётр Чарэвін пісаў у мемуарах, што „мы десятую часть мятежников установили, а сколько убито и скрылось, неизвестно", а Чарэвін быў не проста чалавек шчыры, але прыяцель

працяг ☞ II

9 770546 196000

1881 год: хто забіў Аляксандра II?

1 сакавіка 1881 года карэту імператара Аляксандра II у белы дзень у цэнтры Санкт-Пецярбурга атакавалі двух тэрарыстаў. Ад першай бомбы разнесла карэту і забіла некалькі казакоў з канвоя, але цар выйшаў з абломкаў жывы і цэлы — і тут другі тэрарыст з некалькіх метраў кінуў другую бомбу. Цару адарвала ногі, і ў той жа дзень Аляксандр II памёр, а тэрарыст загінуў на месцы. Так падпольная расійская партыя „Народная воля" выканала даўно вынесены прысуд. Кідальніка першай бомбы схапілі, ім аказаўся нейкі мяшчанін Рысакоў, і хоць пад следствам баявік аказаўся нечакана слязлівым і выдаў усіх, каго мог, але кляўся-бажыўся, што не ведае свайго напарніка, з якім сустрэўся на інструктажы ў апошнюю ноч...

У канцы красавіка 1881 года рускі генерал-губернатар у Вільні генерал-інжынер фон Татлебен атрымаў з Санкт-Пецярбурга сакрэтную пошту, што ў забойстве імператара западозраны нейкі „Гриневицкий из дворян Гродненской губернии", пра што паведаміла... эміграцкая газета „Голос" у Швейцарыі; дадавалася і „фотографическая карточка с мёртвого" — у той час не было ў моргах халадзільнікаў, і адрэзаную галаву баевіка руская контрразведка трымала ў вялізным шкляным посудзе са спіртам. Спіс усяе шляхты Гродзенскай губерні паказаў, што сапраўды ёсць такія Грынявіцкія, а нават „имение Великие Гриневичи Бельского уезда". Асабісты даручэнец Татлебена і капітан віленскіх жандараў рушылі цягнікам з Вільні ў Беласток, адтуль коннай брычкай у бельскія лясы... Місія была строга сакрэтнай.

Следства падазравала адразу двух братоў Грынявіцкіх, якія былі ў Санкт-Пецярбургу да самай вясны 1881 года: „Иван Гриневицкий" спачатку вучыўся ў Пятроўскай Акадэміі лясной і сельскай гаспадаркі, потым яго выключылі... за самавольную арганізацыю складчыны і студэнцкай сталоўкі — кругом сцерагліся „тайных обществ" і рэвалюцыянераў! — але потым такі вось „неблагонадёжный" Грынявіцкі... паступіў на вайсковую службу „вольноопределяющимся" падафіцэрам, і не абы-куды, але ў 2-ую артылерыйскую Ізмайлаўскую Лейб-Гвардыі брыгаду, якая да таго ж стаяла ў Царскім Сяле, і там жа наняў кватэру ў доме... насупраць брамы ў парк з царскім палацам — і вокны кватэры выходзілі акурат на той парк. У той Расійскай імперыі левая галава дзяржаўнага арла была не ў ладах з правай галавою... А ўжо меншы брат, „Игнатий Гриневицкий, студент Технологического инстытута" толькі з восені 1880 года (!), пасяліўся на кватэры старэйшага брата, там жа, у Царскім Сяле. Абодва браты зніклі з кватэры незадоўга да першага сакавіка, пры гэтым брат-артылерыст паспеў... звольніцца з ваеннай службы з прычыны слабога здароўя — брыгадны лекар западозрыў у яго турбекулёз, па-нашаму сухоты.



Момант забойства

Афіцэры губернатара Татлебена сабралі ў Вялікіх Грыневічах сваякоў і суседзяў Грынявіцкіх і, ні слова не гаворачы пра забойства цара, „в строжайшей тайне", прадставілі фотакартку для апазнання. Бацька лейб-гвардзейца і студэнта-тэхнолага, гаспадар Вялікіх Грыневічаў і ўдавец „Иоаким Михаил Гриневицкий"... не пазнаў чалавека на фотакартцы, „уклонился", але ўсе астатнія — „тётка по матери Ядвига Андреева Горская из Домбровских, дядя по матери Осип Домбровский, владелец имения Белановщина, отставной чиновник Иван Фурович, сосед" — у адзін голас прызналі, што чалавек на фотакартцы гэта Ігнат Грынявіцкі, які ў мінулым годзе паехаў у Пецярбург і з таго дня тут не быў. Што ж, шчыра пахваліўся праўдай рэвалюцыйны швейцарскі „Голос", дапамог следству. І следства працягвалася...

Аказваецца, старэйшы брат Ян Грынявіцкі... прыязджаў да Вялікіх Грыневіч у пачатку сакавіка, быў схуднелы, відавочна хворы, нервовы, прабыў некалькі дзён — і выехаў на станцыю Алькенікі паміж Вільняй і Дынабургам, па-руску „Двинск", дзе жылі дзве сястры Грынявіцкіх, а муж старэйшай, інжынер Трафім Пылаеў, быў начальнікам станцыі. Татлебенаўскія афіцэры вярнуліся ў Вільню, далажылі начальству — і той самы капітан жандараў, „негласно" і па-цывільнаму, выехаў у Алькенікі.

Аднак там капітан не адкрыў нічога цікавага. Грынявіцкага ён знайшоў хворым так, як можа быць хворы безнадзейны „туберкулёзнік". Адно толькі, што быў перапалоханы і ўсё рваўся некуды ехаць, але ні сёстры, ні Пылаеў не давалі грошай. Ніхто да Грынявіцкага не прыязджаў, ніхто ім не цікавіўся, ніякай пошты ці другіх перасылак не было. Нарэшце, па чарговай істэрыцы Грынявіцкага, інжынер Пылаеў сам адвёз яго назад у Вялікія Грыневічы. Што праўда генерал-губернатар Татлебен распарадзіўся пра „негласный надзор" за ўсім вялікагрыневіцкім кланам, але рускае следства схілялася да таго, што браты Грынявіцкія былі ў „Народнай волі" людзі выпадковыя... альбо ўвогуле не належалі да арганізацыі, а ўжо ніяк не маглі належаць да палітычнай яе часткі. „Негласный надзор" з Яна Грынявіцкага быў зняты, а „дело" яго спынена ў жніўні 1881 года, калі ён ужо не выходзіў з болю, не ўставаў з ложка і неўзабаве памёр. Імя ж „цареубийцы" Ігната Грынявіцкага... было строга засакрэчана да 1917 года — царскія ўлады не без падставаў сцерагліся „польскіх пагромаў" не толькі на Беласточчыне і Гродзеншчыне, але па ўсёй Расіі, калі б стала вядома, што „царя убил польский шляхтич из мести за освобождение крестьян из-

працяг ☞ III

I ☞ працяг

наступнага цара Аляксандра III і такі самы алкаголік, як цар, для чаго не баяўся нікога і нічога ды пісаў адну „голую правду". Так што „мураўёўская статыстыка" стратаў ізноў няпоўная, а сапраўдныя страты можна ацаніць не ў 13,5 тыс. чалавек, але ад трыццаці да пяцідзесяці тысяч — праўда, гэта ўсе разам, як „зваротныя", па эміграцыях і высылках, так і „незваротныя". Зрэшты, калі чалавек выжыў, але не вярнуўся, а застаўся там — як Авейдэ ў Вятцы, альбо Козэль-Паклеўскі ў Краснаярску — то ён усё роўна страчаны, а нават калі вярнуўся, як невядомы жамойт, хто дажываў свой век па 1883 годзе „поўнай амністыі" ў падковенскай Панямоні, з ласкі яе пана Тамаша Зана-ўнука, той стары, хворы і бязмоўны (!) жамойт... таксама страчаны. Ці гэта шмат, нават калі пяцьдзесят тысяч — бо ж на шэсць губерняў і 8 млн. чалавек?! Але спачатку яшчэ троху статыстыкі...

Калі суадносіць вышэйпаказаную табліцу з паасобнымі губернямі, то лёгка заўважыць, што „няроўна дзеліць Бог", таму што тыя 13 564 „рэпрэсіраваных" раскладаюцца па губернях прыблізна так (месцамі архіўныя даныя так скупыя, што з якой губерні тая ці іншая асоба, дакладна вызначыць немагчыма, апрача таго, ёсць французы, італьянцы і... рускія дэзерціры з рускай арміі; не блытаць з „нашымі польскімі рускімі афіцэрамі", як капітан Серакоўскі):

Губерня	% асуджаных (ад агульнай лічбы М. Мураўёва)
Ковенская	44
Віленская	22
Гродзенская (з Беластокам)	20
Мінская	8
Віцебская*	2
Магілёўская**	2
Іншыя і невызначаныя	2

** практычна ўсе з паветаў на захад ад Полацка;*

*** практычна ўсе звязаныя з Гора-Горацкай Акадэміяй сельскай і лясной гаспадаркі.*

Простым вокам відаць, дзе была „сапраўдная, а не кніжная" партызанка 1863 года. Па-першае, там, дзе „паны і мужыкі" былі адной веры (рымска-каталіцкай), па-другое, там, дзе мужыкі і... ксяндзы (!) былі адной мовы. Для таго жамойцкая Ковеншчына была хіба адзінай „суцэльнай партызанскай губерняй", там страты найбольшыя і... роўныя, з большага, па ўсіх паветах. У Віленскай губерні пераважаюць ... „жамойцкія паветы" і паўночныя „волости" (гміны) Лідскага павета. У Гродзенскай — суседнія паўночныя „волости" Гродзенскага павета, а таксама часткова Ваўкавыскі, Слонімскі... і суседні Навагрудскі павет ужо Мінскай губерні.

Тое ж паказваюць рускія і польскія ваенныя мемуары. Нейкае мілітарнае значэнне мелі толькі чатыры брыгады — капітана Генеральнага штаба Серакоўскага і капітана Аскеркі на Ковеншчыне, падпалкоўніка інжынераў Нарбута ў Гродзенскім і Лідскім паветах ды падпалкоўніка інжынераў Лянкевіча (не блытаць з дыктатарам генералам Лянгевічам!) у сумежных паветах Мінскай і Гродзенскай губерняў. Гэтыя чатыры брыгады ваявалі ад чатырох да шасці месяцаў, альбо вясну-лета 1863 года. Гэтыя чатыры брыгады рускія менавалі „соединённые (!) банды" і ацэньвалі кожную ў 2-3 тыс. чалавек з нармальнай зброяй. Не выдуманых „касінераў", ці дылетантаў са стрэльбамі на качак... Гэтаксама рэдка згадваюцца проста „банды" па 100-150 чалавек, як у паручніка Врублеўскага ці падпалкоўніка інжынераў Траўгута — у гісторыю яны трапілі не тут, а пазней, адзін у 1864 г. у Варшаве, а другі ў 1864 у Лондане і ў 1871 у Парыжы... Найчасцей былі мясцовыя „уездные шайки" ў 20-30 чалавек, але гэта на захад ад Полацка, Мінска і Пінска, а там, за мяжой „першага разбора 1772 года" на лініі Дзвіна-Друць-Днепр, здараліся рэдкія „партии"... ад пяці да дзесяці чалавек, якія стараліся ісці недзе на захад „шукаць нашых", і якіх звычайна лапала мужыцкая „вспомогательная полиция". У падполлі і партызанцы пераважала маладая і малазаможная „наша польская шляхта"; „мужыкоў" ці „мяшчанаў" у карнай статыстыцы лічаныя працэнты, а праваслаўныя мне не сустрэліся зусім... Адно маладое і беднае, шляхецкае пакаленне было ў 1863 годзе — і 50 тысяч чалавек стратаў для таго пакалення гэта восем чалавек з дзесяці. Гэта быў генацыд, які адкінуў „Забраны Край" на паўстагоддзя і больш назад, нават у параўнанні з Польшчай.

— Паўстанне 1863 года спустошыла Літву і Беларусь, — пісаў пазней акадэмік Тадас Іванаускас, меншы брат інжынера Ежы Іваноўскага, найбліжэйшага паплечніка Пілсудскага, і д-ра Вацлава Іваноўскага, пачынальніка беларускага кнігадруку і тыднёвіка „Наша ніва". — Усё лепшае з краю знікла. Засталася такая шляхта, якую і шляхтай назваць можна было толькі вельмі і вельмі ўмоўна...

Пададзеныя вышэй табліцы і факты можна знайсці ў Нацыянальным архіве Беларусі ў Гродне.

Алесь ЧОБАТ

под их польского господства". І на тым можна было б паставіць кропку, калі б не два пытанні: па-першае, як Грынявіцкі толькі-толькі прыехаў у Санкт-Пецярбург, і „чужому" даверылі такую адказную „работу", па-другое, адкуль у далёкай Швейцарыі пра яго даведаліся раней, чым ва ўсемагутнай рускай тайнай паліцыі?

У рускіх архівах, датычных паўстання 1863 года, ёсць сярод іншых спіс „рэвалюцыйнай арганізацыі Саколкі і ўезда", у якім чытаем наступнае: „1) Поручик Валериан Врублевский, начальник Сокольского Егерского Училища — был учредителем мятежной организации в Сокольском Уезде. 2) Иван Гриневицкий, мировой посредник в Сокольском Уезде — был подпольным гражданским начальникам Сокольского Уезда... Врублевский скрылся, Гриневицкий предан вторично военно-полевому суду". Альбо Ян Грынявіцкі, родны дзядзька братоў Яна і Ігната Грынявіцкіх, быў бліжэйшым паплечнікам легендарнага Врублеўскага... і быў асуджаны спачатку на катаргу, а потым на шыбеніцу. Не забудзем, што маці Яна і Ігната паходзіла з тых самых Дамброўскіх, адкуль капітан Яраслаў Дамброўскі, арыштаваны яшчэ ў 1862 годзе як шэф падпольнага „комитета русских офицеров в Польше", а потым адбіты таварышамі з-пад канвоя па дарозе ў Сібір. У 1864 годзе капітан Яраслаў Дамброўскі і паручнік Валерыян Врублеўскі аказваюцца ў Лондане — як ганаровыя госці Устаноўчага кангрэса камуністычнага І Інтэрнацыянала, a propos, у рэзалюцыі кангрэса сказана, што „мы, камуністы, працягваем справу нашых польскіх таварышаў, герояў 1863 года". Такім чынам, абодва Грынявіцкія з Вялікіх Грыневічаў пад Бельскам-Падляшскім належалі да не абы-якой гістарычнай традыцыі — іншая справа, ці самі яны трымаліся той традыцыі... ці маглі быць у кагосьці навідавоку.

Канспірацыйная „Народная воля", прадукт расколу (!) сацыялістычнага падполля ў 1876 годзе, стаяла на самых радыкальных пазіцыях не толькі ў Расіі, але ўва ўсім тагачасным свеце — яе „прямое народное правление" гэта тое самае, што дыктатура пралетарыяту К. Маркса і У. Леніна. Але ж не было ў тагачаснай Расіі пралетарыяту, а таму адзіным сродкам захапіць уладу, устанавіць сваю (!) дыктатуру „народавольцам" бачыўся тэрарызм. Толькі што забіваць і гінуць мелі не самі „дворянские дети", як Андрэй Жалябаў ці дачка генерала Сафія Пяроўская, але іншыя маладыя людзі, бо ж пяроўскія і жалябавы мелі весці Расію і ўвесь свет да „светлай будучыні"... Практыка палітычнага тэрору паказвала, што найлепшыя баявікі нараджаюцца з помсты і нянавісці, а такія найчасцей паходзілі з двух народаў Расійскай імперыі. Гэта былі альбо жыды з прычыны адвечнага ў Расіі антысемітызму, альбо палякі, дакладней, палякі на Беларусі, раздушаныя „мураўёўскім тэрорам" 1863 года, тая „наша польская шляхта", маламаёнткавая, фальваркавая... і беззямельная. Бо не было такога сямейства, каб хтосьці не згінуў на шыбеніцы, не быў высланы ў Сібір, не страціў зямлю і не здэградаваў сацыяльна. Для таго агентура „Народнай волі" ў Санкт-Пецягбургу — а мелі сваіх людзей, як Клетачнікаў, у канцылярыях жандармерыі і паліцыі! — сачыла і адбірала „неблагонадёжных", а ўвогуле мела на воку ўсіх (!) прыбышоў, найперш студэнтаў і вайсковых (!), з заходніх губерняў. З іншага боку, сацыялістычная руская, польская і ўкраінская эміграцыя з Еўропы перасылала ў Расію не толькі літаратуру, грошы ці зброю, але своеасаблівыя „чырвоныя спіскі" тых спадчыннікаў па разбітках 1863 года, на каго эвентуальна можна спадзявацца. Але практыка тэрору паказвала, што адной помсты з ідэямі для баевіка мала...

Ігнат Грынявіцкі

Людзі ёсць людзі — і нават дзеля ідэі ці помсты забіваць пойдзе не кожны. Тым болей, маладыя людзі з „перадавымі ідэямі" — сёння адны ідэі ў галаве, заўтра другія, і тая помста з часам праходзіць... Колькі такіх „ідэйных" правальвала аперацыі! Чалавек з бомбай сам мае быць, як „жывая бомба". І тут мала, каб ён быў „гатовы аддаць жыццё" — ён мае ведаць і верыць, што так і так на гэтым свеце яму не жыць, бо ён безнадзейна і невылечна хворы... І для таго лекары на паслугах „Народнай волі" гэтаксама паведамлялі пра тых студэнтаў-туберкулёзнікаў, а ў сталіцы Імперыі туберкулёз быў „кароль хваробаў". Так што браты Грынявіцкія, найхутчэй, хворыя на туберкулёз абодва (і яшчэ невядома, ад чаго ў маладосці памерла ім маці?!), рана ці позна мелі трапіць на вока агентам „Народнай волі", як кандыдаты на „жывыя бомбы", альбо па-цяперашняму, шахіды. І хутчэй рана, чым позна... Найхутчэй, 1 сакавіка 1881 года на канале Грыбаедава чакаць з бомбамі карэту цара Аляксандра II павінны былі абодва браты Грынявіцкія разам — маўляў, ku chwale Ojczyzny, і „концы в воду". Невядома, што здарылася ў апошні момант з Янам, найверагодней, проста па-людску спалохаўся, але, вядома, што Ігнат не спалохаўся і не прамазаў, а вось узяты з рэзерву „мещанин Рысаков" — ці ён вербаваў тых бамбістаў, калі не Грынявіцкіх, то іншых?! — хоць і справіўся, але не да канца... На следстве „сыпаў" так, што жандары пляваліся, а потым пісаў „прошение", каб жыццё яму новы цар дараваў, сын забітага, Аляксандр III. Такая вось сапраўдная гісторыя „гераічнай" „Народнай волі", „рускага тэрарызму" і яго тэхналогіі, сягоння папулярнай на Бліжнім Усходзе, і трагічная гісторыя братоў Грынявіцкіх з Падляшша.

Аляксандр II

Гэтае „секретное дело" пра кароткае следства віленскага генерал-губернатара Татлебена захоўваецца ў Нацыянальным архіве Беларусі ў Гродне.

А між тым дагэтуль беларуская савецкая і пасавецкая гістарыяграфія сцвярджае нешта зусім адваротнае. З адной энцыклапедыі ў другую пішуць і перапісваюць, не сягаючы лішні раз да архіваў, што „Грынявіцкі Ігнат Яўхімавіч нарадзіўся ў 1855 ці 1856 годзе ў маёнтку Басін Бабруйскага павета Мінскай губерні, вучыўся ў 1875-1880 гадах у Тэхналагічным інстытуце, удзельнічаў у польска-літоўска-беларускіх і рускіх рэвалюцыйных гуртках, вёў прапаганду сярод рабочых, збіраў грошы палітычным вязням, фабрыкаваў пашпарты рэвалюцыянерам. З 1879 года член партыі „Народная воля" (?!). Адзін з заснавальнікаў беларускай фракцыі, нацыянальная праграма якой надрукавана ў 1884 годзе ў часопісе „Гоман" н-р 2. У 1880 годзе з А. І. Жалябавым, С. Л. Пяроўскай і іншымі ўвайшоў у цэнтральны нарадавольскі гурток прапагандыстаў. Адзін са стваральнікаў, аўтараў і наборшчыкаў нарадавольскай „Рабочей газеты"... Пра што можна прачытаць у акадэмічнай „Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" т. 3, стар. 164 за падпісам Міхась Біч і што слова ў слова спісаў Уладзімір Арлоў у папулярнай брашуры „Прысуд выканаў невядомы...".

Ніякі архіў беларускіх савецкіх гісторыкаў пераканаць не здольны, бо так яны гадаваныя: беларуская нацыянальная ідэя магла выйсці толькі з рэвалюцыйнай партыі, а да таго з рускай і толькі рускай рэвалюцыйнай партыі.

І для таго „перасельваюць" таго няшчаснага Грынявіцкага з Бельска ў Бабруйск, робяць з паляка беларуса і з „гарматняга мяса" — майстра на любую падпольную і палітычную работу!

А між тым у 1795-1917 „расійскіх гадах" пяць беларускіх губерняў Расійскай імперыі былі як усё роўна польская правінцыя, дакладней, правінцыя „нашай польскай шляхты" — і як нацыянальна-вызваленчы, так рэвалюцыйна-сацыялістычны рух на Беларусі быў не беларускі, а польскі, адкуль выйшлі як Фелікс Дзяржынскі, так і Юзэф Пілсудскі.

„Беларуская нацыянальная ідэя" як усведамленне свае асобнасці, ад палякаў і ад рускіх, праяўляецца ў XIX стагоддзі не ў рымска-каталіцкім і шляхецкім, але ва уніяцкім і праваслаўным царкоўным асяроддзі. Гэта „rodzina" падляшскай уніяцкай прафесуры на чале з М. Бабро́ўскім у Віленскім універсітэце 1820-х гадоў, потым „поповичи" з Віленскай духоўнай акадэміі 1850-х гадоў і, нарэшце, „белорусские кружки" ў Настаўніцкіх семінарыях у Вільні і на правінцыі ў 1880-х гадах. Ніводная палітычная партыя Расіі і Польшчы да пачатку XX ст. увогуле не жадала бачыць ніякіх беларусаў.

Беларуская нацыянальная ідэя, як і ідэя свае самастойнай культуры і незалежнай дзяржавы, узнікае толькі пасля 1900 года ў асяроддзі сацыялістычнай шляхецкай моладзі каталіцкай правененцыі з „нашай польскай шляхты", першапачаткова як „маральны доўг шляхты перад народам", потым кшталтуецца ў выдавецтве В. Іваноўскага і тыдэвіку „Наша ніва"... і абрастае шматлікімі адэптамі з праваслаўных семінарыстаў. Так узнікае беларускі сацыялістычны рух, які не мае нічога агульнага з рускімі сацыялістамі-рэвалюцыянерамі, у якіх тэрарызм так і застаўся ў цэнтры ўсяе „ідэалогіі" ажно да 1917 года.

Генезіс беларускай нацыянальнай ідэі раскрыты не беларускімі савецкімі, але польскімі беларускімі гісторыкамі — такімі як д-р Алег Латышонак і д-р Юры Туронак.

Алесь ЧОБАТ

На стале пастаўлены ўжо суп, міска картафлянікаў акрашаных алеем і прасяная каша. Свежыны яшчэ няма, трэба пачакаць да Руздва, папасціць. Маці запрашае сям'ю за стол, а бацька ўпамінае мяне: „Як я быў маладым хлопцам, за сталом было ціха, сур'ёзна, хлеб рэзаў і дзяліў усім дзецям бацька...

Пра кудзельнікаў

На дварэ холадна, ветрана, марозу ні каплі, нават снегу таго як на лякарства. Людзей на прыпынку злічыць на пальцах — дзве жанчыны з кошыкамі ў руках, мужчына ў шапцы-вушанцы і я. Нарэшце пад'язджае мой пэкаэс. З радасцю ўскакваю ў амаль пусты аўтобус, купляю білет і займаю месца спераду. Едзем. Робіцца цёпленька, закрываю вочы і думкамі ўжо я ў сваёй роднай вёсцы. Адна за адной плывуць ажыўленыя карціны майго далёкага дзяцінства.

З самай раніцы найстарэйшая сястра прыбірае хату — сёння наша чарга, прыйдуць дзяўчаты з кудзеляй — прыпамінае. — Уставай, пасцель трэба спратаць! — крычыць на мяне, выцягваючы з-пад галавы падушку. Рада не рада ўстаю, мне ж з ёю не ваяваць, у яе востры характар. З крыкам на сястру ўбягаю ў кухню. На стале пастаўлены ўжо суп, міска картафлянікаў акрашаных алеем і прасяная каша. Свежыны яшчэ няма, трэба пачакаць да Руздва, папасціць. Маці запрашае сям'ю за стол, а бацька ўпамінае мяне: „Як я быў маладым хлопцам, за сталом было ціха, сур'ёзна, хлеб рэзаў і дзяліў усім дзецям бацька, а малоць языком, як ты, пры ядзе нельга было". Паслушна сядаю за стол, сёстры таксама. Чорненькая кошачка, якая дагэтуль, здавалася, спала, саскочыла з печы і пачуўшы пах яды пачала церціся аб маю нагу і мяўкаць. І яна атрымала сваю порцыю малочнай кашы. Ля печкі моўчкі бабуля са смакам ела свой каплун — вараныя ў вадзе кавалачкі сухога хлеба, акрашаны алеем або пасалоджаны цукрам. „Бежанскі суп" — так яго называла. Я не ведаю яго смаку, ніколі не спрабавала.

Па снеданні ўсе заняліся сваёю работай: бацька пайшоў у клуню малаціць авёс на святочны кісель, маці з другой сястрой у палоўнік малоць жыта на хлеб у жорнах (не заўсёды былі грошы, каб паехаць у кажанскі млын), а бабуля, як штодзень, села за *куолак* прасці, на мяшкі. Дзень жа кароценькі, зараз сцямнее, а за газнічкам бабуліны вочы не бачаць добра. Толькі я сядзела ля акна, углядалася на „сумны свет за шыбай", як лятаюць і крычаць на ўсё горла вароны, уцякаючы перад разгневаным разбраханым сабакам Фрыцам. Фрыську, як я яго пяшчотна называла, пакінулі ў падсолтыса немцы, калі паспешна ўцякалі перад рускімі. І бацька ўзяў. Вялікі, прыгожы, а да таго разумны і злосны быў наш Фрыц. Каравуліў наш падворак да глыбокай сваёй старасці. Бацька любіў гадаваць сабак. Калісьці, расказвала мама (мяне не было яшчэ на свеце), была ў нас разумніца — сучка Фіфа. Бацька хадзіў з ёю на „зайцы". А калі сама ўначы што злавіла — прыносіла здабычу і клала на прызбу.

Дзень праходзіў хутка. Пасля абеду я нецярпліва выглядала сястрыных сяброўак. Сёння будзе весела ў хаце! Сястра ўжо жарыць гарох на патэльні. Як жа ж — прыйдуць дзяўчаты і хлопцы — гарох мусіць быць! Набяруць яго ў кішэні, будуць есці або кідаць для залётаў у дзяўчат, нібы для забавы, для смеху.

Фота архіў „Нівы"

Цяпер кудзельніц можна пабачыць толькі на сцэне

— Манька з Лідкай ідуць! — крыкнула я ад радасці. Тут жа і Насця з Гандзяй з *куолкамі* ўваходзяць у кухню, а за імі Вера і Нінка. Усе кіруюцца „на хату", прывязваюць кудзелю, накладваюць шнуры, сядаюць на доўгую лаву, што пад сцяною, а сястра выкручвае кнот у нафтавай лямпе, што вісіць высока на сцяне, каб усім было відна. Бяруцца за работу, ды што і раз зіркаюць у вокны — ідуць ужо хлопцы, ці не ідуць? І я дачакацца не магу — прынясуць жа лучыну, раскінуць у сенях, будзе свяціць як пажар. Люба паглядзець.

— Ой, ідуць нарэшце, — ціхенька ўскліквае і хуценька бягу на хату, сядаю на ложак і чакаю...

Уваходзяць: Данька, Сцёпка, Кудзя, Санька, Іван, Косцік і, не паздароўкаўшыся, проста крочаць на хату, да дзяўчат. А тыя ціхенька аб чымсьці шэпчуцца, крадком зіркаюць на хлопцаў, прыдаюць, быццам вельмі заняты кудзеляй і быццам нездаволеныя гасцямі. Адны з іх сядаюць пры дзяўчыне, якая ім падабаецца, другія жартуюць, скідваюць шнуры, а, бывае, і гасяць лямпу.

Увесь вечар гаманілі, смяяліся, а Данька — памятаю — падыходзіў да мяне і ўсё дапытваўся: „Скажы мне, каго любіць твая сястра, ты, напэўна, ведаеш?" Не памятаю, што я адказвала, хоць ведала пра нарачонага. Я часта лезла пад ложак, калі яны „рандкавалі", каб паслухаць, аб чым жа цэлы вечар талкуюць. Нічога ніколі не падслухала, не разумела іх мовы. Вядома, была малая.

— Ну, дзяўчаткі, вячэра на стале, — адкрыўшы дзверы паклікала мама.

Пакідалі кудзелю, ішлі ў кухню, сядалі за сталом і са смакам елі вараныя картоплі з кіслай капустай з алеем і цыбулькай, араматныя агурцы. А хлопцы чакалі „шару годіну", найцікавейшы для іх момант, а і для мяне таксама. Гасілі лямпу, падшчыпвалі дзяўчат, поцемку ж і пацалаваць можна было. Дзяўчаты вырываліся, пішчалі, бараніліся. Я лезла пад стол і, паклаўшы кавалачкі лучыны, з цікаўнасцю прыглядалася яе блеску ў цемры. Пашалелі з паўгадзіны ды зноў браліся за працу. Познім вечарам разыходзіліся, каб заўтра зноў сустрэцца ў іншай па чарзе сяброўкі. Трэба было нямала падгатовіць пражы, каб у Вялікі пост, перад Вялікаднем паставіць кросны ды выткаць тоненькае палатно, якое можна было без сораму паслаць сушыць на поплаве ля рова пры агародах.

Другая мая сястра не ўмела прасці, але затое рабіла прыгожыя шалікі, світэры, шкарпэткі і рукавіцы. Гэта яна мяне навучыла гэтай прафесіі.

— Толькі адзін раз, — казала, — пайшла я прасці на мяшкі, бо нітка грубая, лягчэй было ўвіць. Наша суседка цётка Ганна зрабіла кудзельнік — спрасіла дзяўчат прасці на мяшкі. А падзякай была гасціна.

Раптам хтосьці патрос мяне за плячо: „Прачніцеся (аўтобус паварочваў з шашы на дарогу ў Плёскі), а то праедзеце свой прыпынак". Адкрываю вочы, гляджу, і не пазнаю — а дзе ж прыгожыя старыя таполі, якія раслі паабапал дарогі? Якая ж гэта была любата! Парэзалі! Відаць, былі старыя, небяспечныя для падарожных. І дарога змянілася, прапала яе амаль адвечная краса. Толькі голае чорнае поле вакол!

Іду праз вёску, ужо цемнавата, шмат пустых хатаў, толькі дзе-нідзе ў вокнах святло. На стаўбах загарэліся электрычныя лямпачкі, якія цьмяна асвятляюць вуліцу. Мінаю сваю пустую хатку. Прыгожа размаляваная, толькі вокны сумна і жаласна глядзяць на вуліцу, быццам чакаюць яе нядаўніх жыхароў. Вакол глуха, ціха, толькі вецер свішча ля вуглоў. Робіцца цяжка на душы.

Пакідаю мінулае і шпаркім крокам кіруюся к маім вясковым суседзям — Надзі і Івану, якія шчыра мяне прымуць, як апошнім разам — віном ды смакавітай ягняцінай. Пабалакаем, што чуваць у вёсцы — хто хворы, а хто ўмёр. Раскажам пра поспехі сваіх дзяцей і ўнукаў, а нават закранем аб палітыку. Потым сардэчна развітаемся і са спакоем у сэрцы паеду я дамоў, каб ізноў наведаць родныя куткі ды блізкіх людзей, вясной. Да сустрэчы, дарагія, добрага Вам здароўя ў Новым годзе.

Ніна БРУЧКО

Багаты беднаму не таварыш

Так калісь часта гаварыў адзін мой знаёмы, а да маіх заўваг, што і сярод багатых сустракаюцца прыстойныя людзі, ён адносіўся адмоўна. Гэты чалавек меў шмат зямлі, але жыў бедна, бо ягоная жонка хваравітая была, трэба было даглядаць малых дзяцей і таму з гаспадаркай было яму цяжка спраўляцца. Такіх людзей тады многа было, м.інш. мае бацькі, у якіх зямлі было таксама шмат, працавалі яны салідна, бацька дабра не траціў, шмат што ўмеў зрабіць, м.інш. паставіў хлеў, свіран, клуню, а ў 1960 годзе нават хату — ужо з маёй дапамогай, і яна па сённяшні дзень стаіць на маім панадворку. А кулікаў для крыцця страхі ніхто ў вёсцы лепш ад яго рабіць не ўмеў. Аднак мы жылі бедна, бо бацька не цікавіўся агратэхнічнымі навінкамі і гаспадарыў па-колішняму.

Вярнуся, аднак, да майго знаёмага, да пытання, чаму ён так не любіў багацеяў. Аднойчы, зараз пасля вайны, яму на прадвесні канчалася збожжа і ён паехаў на рынак у Кляшчэлі каб крыху таго збожжа дакупіць. Там па рынку хадзіў ён з мяшком, таргаваўся, і спаткаў свайго кума-аднавяскоўца. Кум спытаў:

— Чаго шукаеце, Сцяпан, на рынку?

— А ці вы не бачыце, што хаджу з пустым мяшком? Хачу купіць крыху жытка, каб пракарміць сямейку.

— Куме, навошта марнаваць грошы? Прыходзьце вечарам да мяне і я вам дарам жытка дам колькі заўгодна.

Вярнуўшыся дадому мой знаёмы прыхапіў пад вечар бутэльку самагонкі і з мяшком падаўся да кума, які лічыўся вясковым багацеем. У час выпіўкі багацей чамусьці не згадвае пра абяцанае жыта, таму мой знаёмы нясмела сам запытаў пра гэта:

— Вы, куме, на рынку абяцалі мне падарыць жытка і я ў гэтай справе да вас прыйшоў. Калі можаце, насыпце; я, вось, і мяшок прыхапіў дзеля гэтага.

— О, дарагі куме, — адказаў гаспадар, — не забыў я свайго абяцання. Падстаўляйце ўсе свае кішэні і я запоўню іх жыткам, абы толькі не дзіравыя яны былі.

Госць падумаў, што яму сніцца або замнога выпіў. Але ягоны кум нанава паўтарыў сваю прапанову. Да таго ж, на бяду, у госця амаль усе кішэні былі дзіравыя. Гаспадар зарагатаў...

Ад сябе скажу: ёсць і багатыя, што падзеляцца і дапамогуць у бядзе, але ёсць і бедныя, што за грош свінства ўчыняць і з царкоўнага парога жабрака прагоняць. Спагада не ў маёмасці, але ў сэрцы чалавека.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Аладкі

Адна жанчына пайшла на вячоркі да сяброўкі, а тая акурат нарыхтавала аладкаў і поўным ротам іх ела, што аж вушы трасліся. Госця прысела побач, а гаспадыня далей есць і выхваляе іх смак аж да нябёс, што яны і далікатныя, і араматныя... Хваліць і хваліць, але пачаставаць і не падумае; гаворыцца ж, што скупасць не глупасць...

Але калі сама гаспадыня бывала ў гасцях у наведаўшай яе цяпер сяброўкі, дык тая заўсёды частавала яе чаем або кавай з аладкамі ці тортам і ніколі не хвалілася сваімі кулінарнымі здольнасцямі.

Госця пасядзела пакуль аж абрыдла ёй слухаць хвальбы з поўнага яды рота, паднялася і направілася да выхаду. На развітанне сказала:

— Прыходзь да мяне на вячоркі, пакаштуеш маіх аладкаў.

(м)